*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**14** ЛІСТАПАДА 2007 г. СЕРАДА

№ 216 (26081)

Кошт 440 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Увага: «Прамая лінія»!

## ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ

На ўсе вашы пытанні, якія датычацца ролі і месца народных традыцый у сённяшнім жыцці, а таксама некаторых аспектаў народнай медыцыны, адкажуць падчас «Прамой лініі» нашы пастаянныя аўтары **загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў кандыдат філалагічных навук Іван Іванавіч КРУК і старшы выкладчык гэтай жа кафедры Аксана Веніямінаўна КАТОВІЧ.**

Як лепш справіць вяселле? Якія правілы існуюць у дачыненні да правядзення хрэсьбін? Як не парушыць рэгламентацыю пахавання і памінання? Як правільна арганізаваць улазіны? Як адзначыць свята ў адпаведнасці з народным календаром? На гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце атрымаць адказы, калі патэлефануеце на нашу «Прамую лінію» **21 лістапада з 12.00 да 14.00 па нумарах: 292 38 92, 292 38 21. (Кантактны тэлефон для папярэдніх званкоў — 292 21 03.)**

Падпіска-2008

## СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВЫ ГОД

**ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА НА І КВАРТАЛ І І ПАЎГОДДЗЕ 2008 ГОДА. ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА» (у рублях)**

| Індэкс | на 1 месяц | на 3 месяцы | на 6 месяцаў |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 8800 | 26400 | 52800 |
| 63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 8300 | 24900 | 49800 |
| 63858 (ведамасны) | 14000 | 42000 | 84000 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 12800 | 38400 | 76800 |

**ПАДПІСКА НА І КВАРТАЛ І І ПАЎГОДДЗЕ 2008 ГОДА. ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА» «Да запатрабавання» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку)**

| Індэкс | на 1 месяц | на 3 месяцы | на 6 месяцаў |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 7460 | 22380 | 44760 |
| 63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 6990 | 20970 | 41940 |
| 63858 (ведамасны) | 9938 | 29814 | 59628 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 9431 | 28293 | 56586 |

## ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

16 лістапада 2007 г. у 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) прадоўжыць работу восьмая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.




У рыбгасе «Сялец» Бярозаўскага раёна ідзе да завяршэння адлоў таварнай рыбы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Аляксандр ЛУКАШЭНКА: «ДА КАНЦА ПЯЦІГОДКІ АБ'ЁМ ВУП ТРЭБА ПАДВОІЦЬ»

**Сёння для Беларусі склалася ўнікальная сітуацыя, у якой эканоміка краіны можа значна прыбавіць. Спрыяльная кан'юнктура цэнаў на сусветных рынках на прадукты харчавання, будаўнічыя матэрыялы, прадукцыю машынабудавання і г.д. адкрывае перад нашай рэспублікай прывабныя перспектывы. Але скарыстацца імі трэба неадкладна. Такім быў лейтматыў нарады ў кіраўніка дзяржавы па праектах прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця, бюджэту і асноўных напрамках грашова-крэдытнай палітыкі на 2008 год, а таксама выніках сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны за 9 месяцаў гэтага года.**

Размова атрымалася напружанай і жорсткай па дзвюх прычынах. Па-першае, абмяркоўваліся найважнейшыя дакументы, якія вызначаць сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны ў будучым годзе. Па-другое, адпаведны тон нарадзе задаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, калі рэальна ацаніў вынікі, з якімі краіна завяршае год. За 9 месяцаў не выканана 6 з 19 найважнейшых параметраў прагнозу на 2007 год. Таму менавіта праблемам, а не дасягненням была нададзена асаблівая ўвага.

У прыватнасці, не забяспечаны прагнозныя тэмпы росту вытворчасці харчовых тавараў, абмежаванне тэмпаў росту імпарту і станоўчае сальда знешняга гандлю. Акрамя таго сёлета не дасягнуты прагнозы ўзроўню рэнтабельнасці рэалізаванай прадукцыі прамысловасці. З гэтай нагоды ў кіраўніка дзяржавы было шмат пытанняў і крытыкі ў адрас урада.

«На жаль, у мяне ўзнікае ўражанне, што дзеючы ўрад пачынае абрастаць цінай, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Вы павінны зразумець, што ваша задача — не проста чарціць графікі і пісаць справаздачы, а прыкладаць намаганні для таго, каб грамадства ўбачыла рэальныя зрухі ў вашай дзейнасці».

Прэзідэнт выказаў упэўненасць у тым, што сёння няма тых праблем, якія мы не маглі б вырашыць.

«Няўжо «Беллегпрам» не можа вырабляць адзенне, якое карыстаецца попытам, каб народ купляў беларускую прадукцыю, а не імпартныя тавары далёка не лепшай якасці?» — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы.

Насельніцтва траціць сотні мільёнаў долараў на набыццё імпартных тавараў, якія маглі б застацца ў Беларусі. Падобныя праблемы ёсць і з канцтарскімі вырабамі, некаторымі іншымі групамі тавараў, а ніякіх мераў урадам не прымаецца.

«Калі ў наступным годзе рост адмоўнага сальда знешнегандлёвай дзейнасці працягнецца цяперашнімі тэмпамі, пад пагрозай апынуцца ўсе нашы дасягненні», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Увогуле, сітуацыя з экспартам склалася даволі парадаксальная: попыт на беларускую прадукцыю за мяжой вельмі высокі. Трэба толькі павялічваць вытворчасць і прадаваць.

У разрэзе праекта бюджэту на 2008 год Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, як выконваецца яго даручэнне па зніжэнні падатковай нагрузкі.

«Мы не можам душыць ні прыватны, ні дзяржаўны сектар сваімі неразумнымі схемамі падатковых выплат, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Сёння ўсе — ад радавога бізнесмена да дырэктара буйнога прадпрыемства — скардзяцца на тое, што яны павінны трымаць па 5 бухгалтараў, каб разабрацца ў падатковых інструкцыях... Майце на ўвазе: яшчэ адна такая скарга — і я буду сур'ёзна разбірацца з падаткавікамі».

У праекце прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2008 год урад прапанаваў прырост валавога ўнутранага прадукту ў памеры 107,5—108,5 працэнта. Аляксандр Лукашэнка адразу ж жорстка выказаўся супраць «калідора» і прапанаваў пакінуць максімальнае значэнне. Хоць і яно, на думку кіраўніка дзяржавы, не з'яўляецца аптымальным.

«Мы спрацаваем, які ВУП павінен быць у 2008 годзе. Пры такім попыце на нашу прадукцыю прырост ВУП павінен быць 20 працэнтаў», — заявіў Прэзідэнт. — Трэба прадаць больш, чым купілі, вось і ўсё».

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што да канца пяцігодкі аб'ём ВУП трэба падвоіць. «Трэба дзякаваць Богу за такую спрыяльную для нас сітуацыю ў сусветнай эканоміцы, калі на прадукты харчавання — попыт, на адзенне і абутак — попыт, пастаянна павялічваецца на экспарт прадукцыя БелАЗа і МТЗ», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Меркаванне пра тое, што ўрад выказаўся за не вельмі напружаныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця, падзялялі і старшыня праўлення Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч, і намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Леанід Анфімаў.

Паводле слоў Пятра Пятровіча, неабходна выстраіць бяспечную сістэму эканомікі і бяспечную фінансавую сістэму Беларусі. Для гэтага ў першую чаргу трэба мець стабільную надзейную нацыянальную валюту. У сваю чаргу, каб мець такую валюту, эканоміка павінна быць эфектыўнай. Беларусі проста неабходна актыўна прыцягваць прамыя замежныя інвестыцыі. Сёння па прыцягненні такіх інвестыцый краіна займае адно з апошніх месцаў у рэгіёне. Для параўнання, калі ў нашу эканоміку з 1 студзеня 2007 года было прыцягнута толькі 2,7 млрд долараў прамых інвестыцый, то ў Чэхіі і Венгрыі — краінах з супастаўнай колькасцю насельніцтва — 77 і 108 млрд долараў адпаведна. Каб палепшыць гэты паказчык, не патрабуецца нейкіх дадатковых фінансавых выдаткаў — «дастаткова зняць усю бюракратыю» і зрабіць інвестыцыйны клімат больш прывабным.

На думку старшыні праўлення Нацбанка, у краіны дастаткова рэзерваў і для стварэння станоўчага сальда да 2010 года. У якасці прыкладу Пётр Пракаповіч прывёў сельскую гаспадарку, дзе вытворчасць малака ў параўнанні з 1990 годам знізілася на 1,4 млн тон, бульбы — на 3,2 млн тон. Калі адновіць былыя аб'ёмы вытворчасці і прадукцыю прадаць за мяжу, пра перавышэнне імпарту над экспартам можна забыцца. Велізарныя рэзервы і ў галіне будаўніцтва жылля. Зараз магутнасці можна падвоіць, і да 2 млн квадратных метраў жылля экспартаваць. Увогуле на існуючых магутнасцях, паводле слоў Пятра Пятровіча, ВУП за год можна павялічыць да 11 працэнтаў. А на гэтым фоне палепшаць і дабрабыт насельніцтва. У 2010 годзе сярэдняя зарплата ў Расіі і Прыбалтыцы прагназуецца на ўзроўні 1000 долараў і 1000 еўра адпаведна.

Пастаноўцы вырашэння акрэсленых задач замінае і састарэлая нарматыўная база. Палажэнні, якія сёння сталі сапраўдным тормазам развіцця эканомікі, неабходна «падчысціць».

Многія з вышэй прыведзеных выказванняў выклікалі незадавальненне членаў урада, а сярод каментарыяў міністраў можна было пачуць, маўляў, «фантастыка». Аднак, як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, ніхто і не абяцаў, што будзе лёгка. Трэба закатваць рукавы і цяжка працаваць. Прэзідэнт адзначыў, што не хацеў бы прыбягаць да кадравых рашэнняў, аднак калі вынікаў не будзе ў першым квартале — паўгоддзі 2008 года, вінаватыя пазбавяцца сваіх партфеляў, а калі прагнозныя паказчыкі не будуць выкананы па выніках 9 месяцаў будучага года, у адстаўку можа пайсці і ўвесь кабінет міністраў.

Па выніках нарады кіраўнік дзяржавы даручыў на працягу двух тыдняў дапрацаваць, удакладніць і ўзгадніць праекты прагнозу, бюджэту і асноўных накірункаў грашова-крэдытнай палітыкі на 2008 год.

**Сяргей ПРОТАС.**

## У НАВАГРУДКУ АСВЕЧАНЫ ПОМНІК ПРАПАДОБНАМУ ЕЛІСЕЮ ЛАЎРЫШЭЎСКАМУ




Помнік прападобнаму Елісею Лаўрышэўскаму ў Навагрудку 10 лістапада асвяціў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. Трохметровы манумент святога ў манаскім адзенні і з крыжам у руках устаноўлены на вуліцы Гродзенскай каля будынка епархіяльнага ўпраўлення.

Паводле слоў благачыннага горада Навагрудка і Навагрудскай акругі протаіерэя Анатоля Герасімука, адкрыццё манумента стала адной з цэнтральных падзей святкавання 690-годдзя ўтварэння Навагрудскай епархіі і 15-годдзя яе аднаўлення. Яны праходзяць падчас урачыстасцяў у гонар 1015-годдзя праваслаўя на Беларусі. Як расказаў протаіерэй Анатоль Герасімук, сын князя Тройната, будучы Елісей Лаўрышэўскі, займаў высокую пасаду пры двары князя Міндоўга. Стаўшы хрысціянінам, ён пакінуў двор, вёў адасобленае жыццё, а затым заснаваў на правым беразе Нёмана ў 1255 годзе Лаўрышэўскі манастыр. Пасля смерці прападобнага яго мошчы былі аб'яўлены цудатворнымі. У 1505 годзе, калі татары, якія спустошылі ваколіцы Навагрудка, наблізіліся да Лаўрышэўскага манастыра, Гасподзь паказаў цуд праз свайго ўгодніка: татарам здалося, што манастырскі двор запоўнены адборнай конніцай, і яны ў страху ўцяклі. Ва ўрачыстасцях у Навагрудку ўзялі ўдзел дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Беларусі Віктар Шэйман і старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Саўчанка. Мітрапаліт Філарэт уручыў Віктару Шэйману ордэн Кірыла Тураўскага.

**Фота Леаніда ШЧАГЛОВА, БЕЛТА.**



РОЗГАЛАС — АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### НАЛЕТА ПЛАНУЕЦЦА ПАВЫСІЦЬ СТАЎКУ ПДВ ДА 20 ПРАЦЭНТАЎ

**У Беларусі памер стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у 2008 годзе плануецца павысіць з 18 працэнтаў да 20 працэнтаў. Аб гэтым паведаміў міністр фінансаў Мікалай Корбут, адпаведная прапанова будзе дакладзена прэзідэнту Беларусі на нарадзе па рэспубліканскаму бюджэту на 2008 год.**

У сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі праектам бюджэту вызначана павышэнне тарыфаў ЖКГ у межах $5 у 2008 годзе. «Разам з тым улічаны неабходныя рэсурсы для таго, каб забяспечыць аплату пастаўшчыкам за спажытыя энергарэсурсы», — адзначыў міністр фінансаў. «Пры гэтым прагназуецца, што грамадзяне будуць плаціць у межах 32—34 працэнты ад праведзеных затратаў», — дадаў Мікалай Корбут. Пры гэтым ён растлумачыў, што павелічэнне расходаў на камунальную гаспадарку звязана з павышэннем цэнаў на энергарэсурсы.

### IP-ТЭЛЕФАНІЯ АХОПЛІВАЕ НОВЫЯ КРАІНЫ

**Чатыры новыя напрамкі IP-тэлефаніі сталі даступны з лістапада абанентам «Белтэлекам»: Албанія, Тайвань, Кенія і Камерун.**

Тэлефанія па пратаколу IP уваходзіць у пералік паслуг інтэлектуальнай платформы і прадастаўляецца пры заключэнні з абанентамі дагавора на «Абаненцкі рахунак» ці «Картачны рахунак», а таксама ўладальнікам Сэрвісных тэлефонных картак. Выкарыстанне гэтых сэрвісаў дазваляе тэлефанаваць за мяжу намнога танней у параўнанні з дзеючымі міжнароднымі тарыфамі. Тэлефанія па IP-пратаколу рэалізавана ўжо больш чым па 30 напрамках: гэта краіны СНД, Еўропы, Блізкага Усходу, Амерыкі, Афрыкі і Міжземнамор'я.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### УСЕ РАЁННЫЯ ГАЗЕТЫ НАЛЕТА ЗМОГУЦЬ ВЫХОДЗІЦЬ ПОЎНАКАЛЯРОВЫМІ

**Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў намеснік міністра інфармацыі Беларусі Ігар Лапцёнак.**

У адпаведнасці з Комплекснай праграмай па падтрымцы дзяржаўных перыядычных друкаваных выданняў у Рэспубліцы Беларусь на 2005—2008 гады для паліграфічных прадпрыемстваў набыта абсталяванне, на якім магчыма друкаваць неабходныя тыражы перыядычных выданняў, што выдаюцца ў абласцях і раёнах. У гэтым годзе закуплена абсталяванне на суму Br1 млрд 700 млн. Завяршаецца яго ўстаноўка ў Віцебскай абласной друкарні і на гомельскім камунальным прадпрыемстве «Сож».

### БОЛЬШ ЯК 1 ТЫС. КІРАЎНІКОЎ АШТРАФАВАНЫ ЗА НЕСВОЕЧАСОВУЮ ВЫПЛАТУ ЗАРПЛАТЫ

**Дзяржаўныя інспектары працы ў студзені—кастрычніку гэтага года правялі 12,3 тыс. праверак выканання наймальнікамі тэрмінаў выплаты заработнай платы. Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў дэпартаменце дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі, парушэнні заканадаўства аб працы выяўлены ў 1 тыс. 512 арганізацыях рознай формы ўласнасці.**

Паводле слоў спецыялістаў, вынесены пастановы аб прыцягненні больш як 1 тыс. кіраўнікоў і іншых службовых асобаў арганізацый да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу ў памеры Br188,1 млн. Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута 567 наймальнікаў, да іх прыменены санкцыі на агульную суму Br409,5 млн.

### ПЕРСПЕКТЫВЫ РОЗНІЧНЫХ ПАСЛУГ ААТ «БЕЛАГРАПРАМБАНК»

**Заўтра ў памяшканні цэнтральнага апарата ААТ «Белаграпрамбанк» адбудзецца другая спецыялізаваная канферэнцыя «Рознічныя банкаўскія паслугі: тэндэнцыі і перспектывы».**

На сустрэчу запрошаны прадстаўнікі Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, Асацыяцыі беларускіх банкаў, топ-менеджары вядучых айчынных і замежных банкаў, кіраўнікі буйных страхавых і IT-кампаній, менеджары прадстаўніцтва міжнароднай плацежнай сістэмы Visa International. Яны разгледзяць разнастайныя аспекты развіцця рознічных банкаўскіх прадуктаў і паслуг, перспектывы і прыярытэты прасоўвання карткавага бізнэсу ў Беларусі, сістэм і тэхналогій аддаленага абслугоўвання кліентаў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**


## КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

**проводит открытый аукцион по продаже зданий пансионата «Багута» 1982 г.п. (в районе Кургана Славы, 5 км.):**
**Лот № 1:** здание пансионата кирпичное (1951,7 кв.м, 4-этажное, состоящее из двух корпусов, соединенных между собой). Площадь земельного участка — 2,07 га.;





**Лот № 2:** здание пансионата бревенчатое, облицованное кирпичом (173,8 кв.м); здание пансионата сборно-щитовое, облицованное кирпичом (159,1 кв.м). Площадь земельного участка — 1,11 га.



**Контактный телефон: (8017) 224 61 34.**
**Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**


### ВАДЗІМ ПАПОЎ ВЫБРАНЫ ПЕРШЫМ НАМЕСНІКАМ СТАРШЫНІ ПАРЛАМЕНЦКАГА СХОДУ САЮЗА БЕЛАРУСІ І РАСІІ

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Вадзім Папоў выбраны першым намеснікам старшыні Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. Такое рашэнне прынята ў Маскве на пленарным пасяджэнні 32-й сесіі Парламенцкага сходу.

Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Сяргей Забалоцец выбраны намеснікам старшыні Парламенцкага сходу.

### ІНФЛЯЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ Ў КАСТРЫЧНІКУ СКЛАЛА 1,5 ПРАЦЭНТА

Інфляцыя ў Беларусі ў кастрычніку склала 1,5 працэнта, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу.

Індэкс спажывецкіх цэнаў на тавары і паслугі ў студзені—кастрычніку гэтага года да снежня мінулага года склаў 107 працэнтаў. Сярэднямесячны прырост цэнаў з пачатку года — 0,7 працэнта.

Нагадаем, што ў адпаведнасці з Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі на 2007 год гадавая інфляцыя запланавана ў межах 6—8 працэнтаў.


белагропромбанк — традиции будущего

ПОБЕДИТЕЛЬ КОНКУРСА «БРЭНД ГОДА 2006»

**ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО "БЕЛАГРОПРОМБАНК"**

**сообщает, что 22 ноября 2007 года проводится внеочередное Общее собрание акционеров в заочной форме. 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.**

**Повестка дня:**

1. Об увеличении уставного фонда ОАО "Белагропромбанк" во исполнение Распоряжения Президента Республики Беларусь от 15 октября 2007 года № 334рп "Об увеличении доли государства в уставном фонде открытого акционерного общества "Белагропромбанк".

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 14 ноября 2007 года.
Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО "Белагропромбанк", его филиалы и отделения по месту нахождения акционеров.
Бюллетени для заочного голосования заполняются и представляются не позднее 20 ноября т.г.
С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО "Белагропромбанк" после 30 ноября 2007 года.

**Телефоны для справок: 8(017) 250 60 01, 228 53 03**


КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.11.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 152,00 |
| 1 еўра | 3 142,24 |
| 1 латвійскі лат | 4 473,55 |
| 1 літоўскі літ | 910,11 |
| 1 чэшская крона | 117,99 |
| 1 польскі злоты | 861,83 |
| 1 расійскі рубель | 87,73 |
| 1 украінская грыўня | 427,79 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*
Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 24,5286 |
| 10 UAH | 48,4573 |
| 1000 BYR | 11,3776 |
| EUR | 35,8461 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 13.11.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпісвайцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

ISSN 1990 - 763X

07216>

## ЧЫНОЎНІК — НАСЕЛЬНІЦТВА: ЁСЦЬ КАНТАКТ?



**Скаргі, пытанні, прапановы, просьбы, патрабаванні — вось яны, формы зваротнай сувязі паміж народам і чыноўнікамі. Як зрабіць яе больш аператыўнай, зручнай, а галоўнае — эфектыўнай? Вядома ж, зафіксаваўшы парадак працы са зваротамі заканадаўча. Дагэтуль ключавым дакументам, што рэгулюе адносіны ў такой сферы, быў закон «Аб зваротах грамадзян», аднак багатая практыка апрацоўкі зваротаў уносіць свае карэктывы і вымагае тым самым удасканаленняў. 18 студзеня ўступіць у сілу Указ Прэзідэнта «Аб дадатковых мерах па працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асобаў». Што гэта будуць за новаўвядзенні і як яны палегчаць жыццё грамадзян? Кампетэнтныя адказы — ад Алы БОДАК, начальніка Галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва Міністэрства юстыцыі Беларусі:**

— Указ № 498 «Аб дадатковых мерах па працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асобаў» уводзіць шэраг прынцыпова новых падыходаў да працы са зваротамі насельніцтва. Абсалютна ўсе палажэнні ўказа накіраваны на тое, каб забяспечыць прыярытэт інтарэсаў грамадзяніна, а не дзяржавы, што і замацавана канстытуцыйна. Адным з ключавых у дакуменце стаў прынцып першапачатковага разгляду зваротаў на месцах. Гэта значыць, што калі праблема грамадзяніна датычыць, скажам, бытавой сферы — ці то кран працякае, ці смеццеправод няспраўны, яму не трэба дасылаць пісьмо ў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі — варта напрамую звярнуцца ў ЖЭС. Рэальная практыка паказвае, што многія грамадзяне, мінуючы арганізацыі на месцах, дасылаюць лісты адразу ў рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання — так, на ўсякі выпадак. Вядома ж, такога быць не павінна, бо ў першую чаргу гэта пярэчыць інтарэсам саміх грамадзян, зацягвае вырашэнне іх праблем. Атрымліваецца, што орган рэспубліканскага прызначэння займаецца не сваёй справай, у той час як тая ўстанова, у чыю кампетэнцыю ўваходзіць вырашэнне пытанняў такога тыпу, нават і не здагадваецца пра існаванне праблемы. Вы здзівіцеся, але і да нас, у Міністэрства юстыцыі, часта звяртаюцца з праблемамі ў жыллёва-камунальнай сферы, і аналіз паказвае, што пытанні гэтыя, як правіла, не да міністэрстваў, а да канкрэтнага ЖЭСа. І толькі ў тым выпадку, калі пасля звароту ў пэўную камунальную службу праблема засталася нявырашанай альбо прынятае рашэнне не задаволіла жыхара, ён можа і павінен звярнуцца ў вышэйстаячыя арганізацыі — галоўныя ўпраўленні, аддзелы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, жыллёвай палітыкі, гарадской гаспадаркі абласных, Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

14 лістапада 2007 г.
№ 43 (97)


КАМАНДЗІРОЎКА ПА ПІСЬМУ

## ЖЫВЁМ ДОБРА, АЛЕ...

**Звычайна людзі пішуць у газету, каб паскардзіцца, знайсці дапамогу ў вырашэнні нейкай складанай сітуацыі, атрымаць адказ на пытанне. А калі ўсё добра, дык навошта паперу пераводзіць? Вось чаму ліст жыхаркі вёскі Дзераўная Хатаўскога сельсавета Стаўбцоўскага раёна Ніны Сямёнаўны Даўгапол нас крыху здзівіў. На першых чатырох старонках свайго аб'ёмнага пісьма яна падрабязна апісала, якія добрыя сацыяльна-бытавыя ўмовы створаны ў вёсцы. Ёсць там дзіцячы садок, дзве школы — агульнаадукацыйная і школа мастацтваў, лазня, бібліятэка, стадыён, бальніца, магазіны. У Дзераўной асфальтуюцца вуліцы, «падводзіцца вада», «работнікі сувязі займаюцца тэлефанізацыяй вёскі». Добра працуюць мясцовыя прадпрыемствы — СВК «Дзераўное» і ПМК-74. Знайшлося ў лісце Ніны Сямёнаўны месца і для крытычных заўваг. Праўда, яны выказаны не ў форме прэтэнзій, а як пажаданні — што можна было б яшчэ зрабіць, каб палепшыць жыццё мясцовых жыхароў. На самай справе, куды больш карысным і прадуктыўным было б адрасаваць іх не сталічным журналістам, а мясцовым уладам, чыя непасрэдная задача — вырашэнне пытанняў жыццезабеспячэння людзей. Тым не менш, ліст Ніны Сямёнаўны стаў для нас нагодай, каб завітаць у вёску Дзераўная і на ўласныя вочы пабачыць, ці ўсё там так добра, як апісала пенсіянерка, а заадно агучыць мясцовай уладзе пажаданні жыхаркі сельсавета.**



У вёсцы і сапраўды поўным ходам ідуць рамонтныя работы — да канца года тут будзе адкрыты аграгарадок. Практычна завершаны работы па будынках сярэдняй школы і ашчаднай касы. У працэсе рэканструкцыі фізкультурна-аздараўленчы комплекс. У большай ці меншай ступені рамонт закрануў усе сацыяльна значныя аб'екты вёскі: бальніцу, ФАП, магазіны, комплексны прыёмны пункт.

Сур'ёзных фінансавых затрат патрабуе Маладзёжны цэнтр, дзе арандуе памяшканне сельскі Савет дэпутатаў. Будынак знаходзіцца ў аварыйным стане. На момант візіту карэспандэнта там якраз завяршыўся рамонт даху і распачаліся ўнутраныя работы. Нягледзячы на восеньскія замаразкі, члены сельвыканкама пакуль працуюць без ацяплення — у ходзе рэканструкцыі будынак часова «адрэзалі» ад агульнай сеткі. Работы вядуцца даволі марудна. Сітуацыя ўскладняецца яшчэ і тым, што на тэрыторыі СВК «Дзераўное» ёсць аналагічны аб'ект — Дом культуры. ДК працуе і сёння. Для прывядзення яго ў той стан, які б адпавядаў статусу аграгарадскога сацыяльнага аб'екта, неабходна непараўнальна менш сродкаў, чым для рэканструкцыі Маладзёжнага цэнтра. Аднак апошні таксама патрэбны вёсцы: для правядзення гуртковай работы, пасяджэнняў Савета, а таксама — для рэгістрацыі шлюбаў. Пакуль што ўрачыстыя цырымоніі (якія, прынамсі, адбываюцца даволі часта) праводзяцца ў зусім не ўрачыстай (у плане інтэр'еру) абстаноўцы. У невялікім кабінеце старшыні (з савецкай яшчэ мэбляй і без ацяплення) не могуць размясціцца ўсе ахвотнікі. Большая частка гасцей вымушана цясніцца ў калідоры. «Дэмаграфічная сітуацыя ў Дзераўной нармальная, шлюбаў мы рэгіструем даволі многа, таму, вядома ж, хацелася б праводзіць такую святочную цырымонію ў адпаведных умовах», — прызналася старшыня Хатаўскога сельскага Савета дэпутатаў Таццяна Босая.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

## ЯК ВАША СКАРГА АДГУКНЕЦЦА?..



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

*Святлана Іванаўна АСТРЭЙКА, стараста вёскі Слабада-Кучынка*



**— Я разумею, што людзям хочацца знайсці адказы на свае пытанні тут і зараз. І мясцовая ўлада практычна ўсе мясцовыя праблемы вырашыць у стане, — лічыць старшыня Слабада-Кучынскага сельскага Савета дэпутатаў Капыльскага раёна Нэлі Гусева. — Калі ж зрабіць гэтага яна не можа, значыць, пытанне пакуль што ў прынцыпе невырашальнае. Або скарга не мае пад сабой ніякіх падстаў.**

У канцы кожнага года Нэлі Эдуардаўна аналізуе звароты жыхароў свайго сельсавета ў вышэйстаячыя інстанцыі — нават калі не запрашаюць да непасрэдных разбораў па тым ці іншым пытанні. У мінулым годзе з 9 такіх зваротаў 6 былі прызнаны неабгрунтаванымі, у выніку чаго заяўнікі атрымалі адмоўныя адказы.

Слабада-Кучынскі сельсавет самы вялікі на Капыльшчыне — 26 населеных пунктаў раскіданы па ўсёй яго тэрыторыі. Тры вёскі з'яўляюцца «уязнымі варотамі» ў раён і патрабуюць асаблівай увагі да свайго вонкавага выгляду. Яшчэ адна асаблівасць — вялікая колькасць дачнікаў. Апошніх прывабліваюць удалае месцазнаходжанне тутэйшых вёсак (80 км ад сталіцы) і невысокія цэны на жыллё (дом можна купіць за 800—1000 умоўных адзінак). Мясцовыя жыхары прыхільна ставяцца да новых суседзяў — чым больш у вёсцы народу, тым весялейшае жыццё. Ды і сядзібы ў прыезджых акуратныя, на гарадскі манер — клумбы, кветкі, альпійскія горкі...

Аднак і прэтэнзій да мясцовай улады ў гараджан хапае.

— Зразумела, узровень жыцця ў горадзе вышэйшы, сродкаў на добраўпарадкаванне, на камунальную гаспадарку выдзяляецца там значна больш, — тлумачыць Нэлі Эдуардаўна. — Сюды гараджане прыязджаюць з аналагічнымі патрабаваннямі: дайце нармальнае асвятленне, зрабіце добрую дарогу, спілуйце аварыйнае дрэва... Усё гэта мы, безумоўна, робім. Але не так хутка, як ім хацелася б.

Вёска не горад. Тое ж спілоўванне аварыйных дрэў тут — сапраўдная праблема, вырашэнне якой каштуе вельмі дорага. Адзін заказ вышкі ў абласной ЖКГ выліваецца ў вар'яцкую суму. Між тым, на добраўпарадкаванне населеных пунктаў Слабада-Кучынскаму сельсавету выдзелена сёлета ўсяго 3 млн рублёў. Большая частка іх пайшла на ўстаноўку агароджаў на могілках, абкошванне і прывядзенне ў належны выгляд населеных пунктаў. Для таго, каб арганізаваць хоць бы частковае спілоўванне, неабходна, каб прыехала брыгада раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, прадстаўнікі раённых электрасетак, сувязісты — прычым усе яны павінны быць задзейнічаны адначасова, што не так проста зрабіць... Адсюль — вялікая колькасць скаргаў на наяўнасць небяспечных дрэў. Ускладняе вырашэнне праблемы і адсутнасць у раёне сваёй аварыйнай вышкі.

— Аднавілі мы вулічнае асвятленне, але старыя слупы і ліхтары засталіся, — расказвае Нэлі Гусева. — Яны могуць патухнуць ужо праз дзень пасля рамонту. А брыгада раённых электрасетак, якая абслугоўвае 211 населеных пунктаў, не ў стане адначасова ліквідаваць усе непаладкі... І гэта таксама нараджае незадаволенасць і, адпаведна, скаргі грамадзян.

Затое ніякіх нараканняў няма ў гэтым сезоне на забеспячэнне палівам. (А гады два таму давялося моцна панервавацца напярэдадні зімы — торфабрыкетны завод не працаваў, паліва, якога не хапала, размяркоўвалася строга па чарзе.)

Дарэчы, Указ Прэзідэнта № 498 «Аб дадатковых мерах па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асобаў» старшыня Слабада-Кучынскага сельскага Савета лічыць своечасовым і вельмі патрэбным.

— У першую чаргу таму, што з новага года звароты грамадзян будуць накіроўвацца не туды, куды гэтыя грамадзяне захочуць, а «па іерархіі» — пачынаючы з мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, нізавога ўзроўню. І толькі калі заяўнік не будзе задаволены вынікам, ён зможа абскардзіць яго ў вышэйстаячых інстанцыях. А значыць, лістоў у Адміністрацыю Прэзідэнта з просьбамі пераверыць прысядзібны ўчастак ці пераналічыць пенсію цяпер будзе менш, — упэўнена Нэлі Гусева. Часта людзі, разумеючы, што вырашыць нейкае пытанне сабе на карысць (і часам у абыход закона) у іх не атрымаецца, пачынаюць бамбардзіраваць пісьмамі высокія інстанцыі. Такія заяўнікі спадзяюцца, што дастаткова зверху «націснуць» — і на месцах зробяць так, як «палажана». Але ж «націскаць» без праверкі фактаў ніхто не будзе. А праверка звычайна завяршаецца не на карысць «праўдалюбца». Напрыклад, адзін наш дачнік, заслужаны чалавек, які ў Мінску карыстаецца ўсімі належнымі льготамі, запатрабаваў, каб агароджу на яго прысядзібным участку мы пабудавалі за бюджэтны кошт. Пагражаў, скардзіўся... Але ў выніку ўсё ж вымушаны быў заплаціць грошы за штыкет.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

ОСОБОЕ МНЕНИЕ

## ГДЕ УВИДЕТЬ ДЕПУТАТА?

**Скоро будет год, как отшумела предвыборная кампания в местные Советы депутатов, а срок полномочий депутатов Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь заканчивается в следующем году...**

Предвыборные кампании всегда отличаются активностью кандидатов: много встреч, выступлений, плакатов, лозунгов. Но вот в установленный день прошли выборы, получили полномочия от своих избирателей депутаты. Как же строят они свою работу с гражданами? Вот об этом я и хочу поговорить. В частности — о работе депутатов г. Поставы в 12 и 13 избирательных округах, что находятся в бывшем военном городке № 6.

Как правило, контакт депутата с избирателями происходит во время приемов по личным вопросам и встреч на собраниях. Как избиратель отмечу, что у нас на Поставщине депутат Палаты представителей Национального собрания Ванда Фердинандовна Янукович ведет прием по личным вопросам систематически, в своем кабинете, а о времени приема заранее сообщается в районной газете «Поставский край». А вот депутаты местных советов нашего микрорайона о месте и времени приема граждан, видимо, никак не объявляют — по крайней мере, избиратели этих объявлений не видят. А ведь их можно поместить и на почте, и на досках объявлений, да и в других массово доступных местах, как это делается в период предвыборной кампании. Законодательством предусмотрено, что депутат Совета регулярно, не реже одного раза в месяц осуществляет личный прием граждан. Но из-за того, что о личных приемах граждан как-то не объявляется, мы, избиратели, стали забывать фамилии своих избранников. Конечно, при желании попасть на прием к депутату Совета не так уж сложно, все они живут и работают на Поставщине и найти их, обратившись в райисполком, не составит большого труда. Но этот путь не добавляет авторитета депутатам.

Второй формой контактов депутатов всех уровней со своими избирателями являются встречи на собраниях, которые должны проходить в актовых залах, аудиториях и т.п. Значение встреч трудно переоценить — на них депутаты отчитываются о своей работе по выполнению обязательств, информируют избирателей о работе Советов, изучают общественное мнение. Так должно быть. Но, опять же, складывается впечатление, что в нашем городке депутаты встреч с избирателями вообще не организовывают. Может быть, собраний не происходит из-за отсутствия результатов для отчета по выполнению предвыборной программы? Или незнания требований законодательства, касающихся обязанностей депутатского корпуса? Приведу некоторые положения Закона о Статусе депутата местного Совета.

Так, в статье 20 «Проведение депутатом Совета встреч с гражданами» записано: «Депутат Совета проводит встречи с гражданами в целях информирования их о своей деятельности в Совете и его органах, изучения общественного мнения по вопросам, рассматриваемым на сессиях Совета и заседаниях его органов, потребностей населения, а также содействия развитию различных форм местного самоуправления». А в статье 21 записано, что «депутат Совета ответственен перед избирателями и подотчетен. Депутат Совета обязан периодически, но не реже двух раз в год отчитываться перед избирателями о своей деятельности и ходе выполнения предвыборной программы, о работе Совета и его органов. Отчеты депутатов проводятся на собраниях избирателей». В этом же законе в ст. 19 сказано, что «депутат Совета регулярно, но не реже одного раза в месяц осуществляет личный прием граждан».

Иногда можно услышать мнение, что депутатами в основном являются представители руководящего состава района и в силу производственной занятости у них нет времени на встречи с нами. Конечно, это неудачное оправдание. Один раз в полгода объехать населенные пункты своих избирательных округов не только полезно, но и интересно. В нашей жизни много вопросов по жилью, трудоустройству, работе ЖКХ, функционированию транспорта, торговли и т.д., которые могут создавать определенную социальную напряженность. Но если люди увидят, что депутаты на деле стараются им помочь, то уровень социальной напряженности останется незначительным, а авторитет властей всех уровней будет повышаться. Но для этого нужно идти к людям, встречаться с коллективами, а не отсиживаться на сессиях с газетой. Нередко подобная депутатская деятельность заслуживает того, чтобы некоторых депутатов избиратели через процедуру отзыва заменили на других (Но в жизни, к сожалению, подобная крайне пассивная работа в депутатском корпусе иногда помогает руководителю... занять более высокий пост.) Не могу утверждать, что такой уровень работы депутатов с избирателями наблюдается и в других округах, но уверен, что проблема, поднятая мною, актуальна и требует анализа. Ну, а мы жители 6-го городка, ждем наших депутатов...

**Владимир БОРОВКО,**
**ветеран Вооруженных Сил.**

АДВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

## ПАРАЗМАЎЛЯЙ СА МНОЙ, УЛАДА

**Вось жыву я, напрыклад, у шматпавярховым доме з вялікай, як гэта бывае ў гарадах, колькасцю пад'ездаў. І на кожным паверсе, у кожным пад'ездзе — свае праблемы. Людзі іх вырашаюць як могуць: з некім сварацца, на кагосьці скардзяцца, з кімсьці спрачаюцца, адным словам, вырашаюць. А я... цярплю. Трымаю сябе ў руках. І калі моцныя дажджы топяць па ўсіх кутах мой балкон, і калі ад суседняга будаўніцтва новага дома бессаромна трашчыць па швах «мой уласны» дом, і калі машыны паркуюцца ледзь ці не на газоне...**

**І вось аднойчы даведваюся, што пад маімі вокнамі, якія выходзяць на невялікую, свабодную ад усялякіх збудаванняў пляцоўку, плануецца ўзвесці... ажно два шмат'ярусныя паркавачныя комплексы! Безумоўна, я за тое, каб аўтамабілі не псавалі газон і мелі належнае месца для начлегу. Але ў мяне ёсць і контраргументы: непадалёк ад дома пакуль не «намалявалася» ні магазіна, ні аптэкі, ні іншых радасцяў галіны паслуг. Няма і чагосьці падобнага на паркавую зону, у якой можна было б займацца спортам, гуляць з дзецьмі ці выгульваць сяброў нашых меншых. І я думаю: не хачу болей трываць. Але каму я павінна пра ўсё гэта паведаміць? І дзе гарантыя, што мяне хоць бы выслухаюць?**

**Пытанняў шмат, адказ — адзін.**

**Мясцовая ўлада ўсё ж стане рэальна бліжэй да народа. З новага года ўступіць у сілу Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 498 «Аб дадатковых мерах па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асобаў», які замацаваў прынцып першачарговасці зваротаў у мясцовыя органы ўлады. І пакуль пад маімі вокнамі не загула спецтэхніка, я маю рэальны шанц на гутарку з прадстаўнікамі раённай улады.**

**Але якім чынам паступіць: напісаць пісьмо? Ці проста патэлефанаваць?**

Мясцовая ўлада стане рэальна бліжэй да народа.

— Праблема канкрэтнага чалавека павінна быць зафіксаванай і такім чынам прынятай на кантроль, — тлумачыць ***начальнік упраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Станіслаў БУКО.*** — У процілеглым выпадку той, да каго чалавек аднойчы звяртаўся ў вуснай форме, можа сказаць, што першы раз чуе аб праблеме. Перавага — за пісьмовым зваротам, які яшчэ варта і аформіць належным чынам. Найменне дакумента, прозвішча, сутнасць, асабісты подпіс. Разборлівым почыркам і без зневажальных слоў. Гэта абавязкова. Паколькі ў іншым выпадку зварот можа быць не прыняты да разгляду.

Падчас работы з паперай сам заяўнік мае магчымасць некалькі разоў усё абдумаць, не ўпусціць дэталі. Са зваротам на паперы прасцей працаваць і прадстаўнікам улады. Можна ўдакладніць змест, накіраваць копію ў тую структуру, ад якой уласна і залежыць вырашэнне пытання. Аднак калі вы спачатку палічылі неабходным патэлефанаваць у той жа сельскі Савет ці райвыканкам, значыць, там вас павінны выслухаць і патлумачыць неабходнасць пісьмовага выкладання праблемы або даць іншыя рэкамендацыі. Бо цалкам выключаць магчымасць вуснага звароту немагчыма. Скажам, у вёсцы, дзе ўсе добра адзін аднаго ведаюць, многае можна вырашыць у тэлефоннай ці прыватнай размове. Я лічу, што любы зварот, нават вусны, павінен быць разгледжаны.

**— І ўсё ж, калі пісаць, дык адразу на адрас Прэзідэнта — так мяркуюць многія людзі...**

— Вось гэта якраз і з'явілася прычынай падпісання дадзенага Указа — узмацненне адказнасці мясцовых выканаўчых распарадчых органаў за разгляд зваротаў грамадзян. Практыка паказвае, што ў нас каля 70 працэнтаў зваротаў знаходзяцца ў кампетэнцыі сельскіх і пасялковых Саветаў, раённых і абласных выканаўчых органаў. Безумоўна, у Адміністрацыі не могуць убачыць, як склалася сітуацыя, напрыклад, у Кобрынскім ці Шчучынскім раёне. Таму зварот усё роўна дасылаецца на месца. Атрымліваецца лішняя перапіска. З другога боку, чаму так атрымліваецца? Таму што існуе такое меркаванне: на месцы справу прамарудзяць і нічога не вырашаць, а калі напісаць Прэзідэнту, то ён абавязкова яе разгледзіць, прыме меры і навядзе парадак. Верагодна, падставы для такога меркавання ёсць. Трэба прызнаць, што мясцовыя органы не заўсёды эфектыўна і ўсебакова разглядаюць звароты грамадзян.

Павінен заўважыць, што.ў нашай краіне існуе паўнацэнная нарматыўна-прававая база, звязаная са зваротамі грамадзян — закон, дэкрэт, дырэктыва, шэраг указаў. Гэта сведчыць аб той вялікай увазе, якую наша дзяржава на чале з яе кіраўніком надаюць вырашэнню праблем грамадзян. Наогул работа са зваротамі грамадзян — адно з галоўных, прыярытэтных накірункаў дзейнасці любога органа дзяржаўнай улады і іх кіраўнікоў. Менавіта гэта работа з'яўляецца крытэрыем ацэнкі дзейнасці кожнага дзяржаўнага органа і яго кіраўніка.

Дарэчы, варта адзначыць, што апошнім часам сітуацыя пакрысе мяняецца да лепшага. Так, у 2006 годзе на адрас Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь паступіла звыш 40 тысяч зваротаў, а за 9 месяцаў гэтага года — каля 22 тысяч. Гэта сведчыць аб тым, што мясцовыя органы ўлады пачалі працаваць лепш. Хоць, безумоўна, гаварыць аб тым, што ўсё ў нас бездакорна, заўчасна. Але на дадзеным этапе ў накірунку наладжвання работы канкрэтных структур, каб людзі не хадзілі па дзесятках інстанцый, робіцца вельмі многае. Я лічу вельмі важным укараненне таго ж прынцыпу «аднаго акна».

**— Якім чынам будзе разглядацца мой пісьмовы зварот? І як мне даведацца, што прыйшоў час звяртацца ў вышэйстаячую структуру?**

— Разгляд у тым жа сельвыканкаме ці райвыканкаме працягваецца 15 дзён, калі сітуацыя не патрабуе дадатковага разбору, і 30 дзён, калі ёсць патрэба ў дадатковым вывучэнні і праверцы. Калі сітуацыя не можа быць вырашана на дадзеным узроўні, зварот дасылаецца ў вышэйстаячую арганізацыю на працягу 5 дзён, аб чым паведамляецца заяўніку. Заяўнік у выніку павінен абавязкова атрымаць станоўчы, растлумачальны або адмоўны адказ.

**— Калі тэрмін выйшаў, а адказу няма?**

— Гэта недапушчальная сітуацыя, такога быць не павінна, але калі здарылася, то трэба зноў звярнуцца ў той жа орган. Пазначце ў чарговым звароце, што з моманту адпраўкі вашага першага ліста сітуацыя не змянілася і вы чакаеце растлумачэнняў з гэтай нагоды. Далей, калі вам дашлюць адмоўны адказ, можаце звяртацца з атрыманым дакументам у вышэйстаячыя арганізацыі, спіс якіх павінен размяшчацца на стэндах — бачных месцах у дзяржструктурах.

**— Многія пытанні, праблемы, з якімі людзі звяртаюцца да прадстаўнікоў улады, патрабуюць немалых матэрыяльных выдаткаў. У прынцыпе, па гэтай прычыне і замаруджваецца іх вырашэнне...**

— Сапраўды. Тут важна разумець: мы павінны жыць па сродках. Прыгадайце, колькі часу прайшло з таго моманту, як наша краіна стала самастойнай. Шаснаццаць гадоў. Для гісторыі гэта — імгненне. Заходнія краіны ішлі да свайго сённяшняга дабрабыту значна больш часу. Але калі мы параўнаем нядаўняе мінулае з тым, што ёсць цяпер, адразу стане відавочным, наколькі імклівымі тэмпамі мяняецца наша жыццё. Усё і адразу, на жаль, мець немагчыма. Безумоўна, хочацца, каб у вёсцы ўсе вуліцы былі заасфальтаваныя, былі газ, водаправод, але гэта нерэальна зрабіць у адно імгненне, дый спатрэбіцца немалая колькасць грашовых сродкаў. Менавіта яны і вызначаюць асноўныя аспекты гарадскіх, раённых, абласных гадавых планаў сацыяльна-эканамічнага развіцця. Падчас падрыхтоўкі такога праекта мясцовыя ўлады супастаўляюць тое, што трэба зрабіць, з тымі фінансавымі магчымасцямі, якімі яны распараджаюцца.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

«МС» ВЫСТУПІЛА.
МЯСЦОВЫЯ ЎЛАДЫ АДРЭАГАВАЛІ

## ВАДОЮ ЗАБЯСПЕЧАНЫ...

**17 кастрычніка ў «Местном самоуправлении» быў надрукаваны артыкул «Куды знікае вада?» — аб праблемах з забеспячэннем вадой жыхароў вёскі Пуцілава Гайненскага сельсавета Лагойскага раёна.**

Днямі рэдакцыя атрымала адказ на публікацыю за подпісам намесніка старшыні Лагойскага раённага выканаўчага камітэта С. Мамацюка: «Лагойскі раённы выканаўчы камітэт, разгледзеўшы артыкул «Куды знікае вада?», паведамляе, што ў населеным пункце Пуцілава Лагойскага раёна ўсе рамонтна-будаўнічыя работы па водазабеспячэнні завершаны: праведзена замена глыбіннай помпы на артэзіянскай шчыліне і ўсталяваны дзве новыя водазаборныя калонкі.

У дадзены час водазабеспячэнне вёскі Пуцілава адбываецца ў поўным аб'ёме».

## КРЭДЫТ НА КАПРАМОНТ?

**Арганізацыі ЖКГ на Міншчыне абслугоўваюць больш чым 7,5 тысячы жылых дамоў. З іх 450 агульнай плошчай звыш 1,2 млн кв. м маюць патрэбу ў правядзенні работ па цеплавой мадэрнізацыі.**

Як адзначыў генеральны дырэктар Мінскага абласнога ўнітарнага прадпрыемства «Упраўленне жыллёва-камунальнай гаспадаркі» Аляксандр ЖУРАЎСКІ, усяго на выкананне гэтых мерапрыемстваў неабходна каля 736,4 млрд рублёў. На капітальны рамонт і цеплавую мадэрнізацыю сёлета прадугледжана ўсяго 37,8 млрд рублёў, з якіх бюджэтныя сродкі складаюць 8,4 млрд, а астатняе — адлічэнні жыхароў на капрамонт (адпаведныя плацяжы штомесяц выстаўляюцца ў «жыроўцы». — **М.Л.**).

Але і тут ёсць відавочны рух наперад: калі летась пасля цеплавой мадэрнізацыі на Міншчыне ўведзена 18,5 тысячы квадратных метраў жылля, то сёлета, як плануецца, — каля 22 тыс. Для забеспячэння жыхарам камфортных умоў і нармалізацыі тэмпературнага рэжыму жылля праводзіцца ўцяпленне асобных кватэр і тарцовых сцен будынкаў. За першае паўгоддзе на гэтыя патрэбы было выдаткавана 633 млн рублёў. За кошт бюджэтных сродкаў можна правесці цеплавую мадэрнізацыю толькі 1 з 5 будынкаў, якія маюць такую патрэбу. Адзін з магчымых варыянтаў — прыцягненне сродкаў насельніцтва. У невялікіх населеных пунктах на адпаведныя мэты жыхары могуць браць крэдыты на 20 гадоў пад 3 працэнты гадавых.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

# ЯК ВАША СКАРГА АДГУКНЕЦЦА?..

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Змяншэнне колькасці зваротаў у сельвыканкам, на думку яго старшыні, напрамую залежыць і ад работы старастаў. Менавіта яны могуць зняць «напружанне» па тым ці іншым пытанні, своечасова папярэдзіць кіраўніка Савета аб «выбухованебяспечнай» сітуацыі... Святлана Іванаўна Астрэйка, староста вёскі Слабада-Кучынка, у гэтым плане ўвогуле чалавек унікальны. Сабраць дабравольныя ўзносы на добраўпарадкаванне могілак, дапамагчы правесці перапіс насельніцтва, праконтраляваць навядзенне парадку на прысядзібных тэрыторыях — гэта само сабой. Няма ў вёсцы дома, дзе Святлана Іванаўна не пабывала б асабіста, няма сям'і, праблемы якой яна не выслухала б. Здаецца, што і жыве жанчына не для сябе — для людзей, бо дапамогу ім, зносіны з імі лічыць сваім абавязкам... У свой час менавіта яна ўзняла пытанне па лазні (у калгасе скончылася паліва, і яе перасталі ацяпляць). Калі па вёсцы пайшоў транспарт, нагружаны бочкамі з навознай жыжай, і людзі пачалі абурацца, Святлана Іванаўна першай звярнулася і да старшыні сельскага Савета, і да дырэктара сельскагаспадарчага філіяла «Крыніца» з патрабаваннем накіроўваць машыны ў аб'езд. А калі нехта з вадзіцеляў па звычцы зноў паехаў праз вёску — перагарадзіла дарогу... Пра Святлану Іванаўну расказваюць легенды, а яна ўсміхаецца: такая мая «місія», я без гэтага не магу...



*Старшыня Слабада-Кучынскага сельскага Савета дэпутатаў Нэлі ГУСЕВА.*

Здаецца, дробязь, а карысць відавочная. Людзі не ў «інстанцыі» пішуць, а ідуць з просьбай да старасты. Потым, пры сустрэчы, абдымаюць, як родную, дзякуюць...

Аднак у кожнага «медаля», як вядома, ёсць два бакі — менавіта пра гэта мы гаварылі са старшынёй Капыльскага раённага Савета дэпутатаў Марыяй Сандрозд. Не сакрэт, што павышаная ўвага ўлады да праблем людзей нараджае ў пэўнай іх часткі ўтрыманскія настроі. Ды і скаргі на ўсе «паверхі» пішуць у асноўным адны і тыя ж — ад некаторых прозвішчаў чыноўнікі і кіраўнікі арганізацый ужо ўпадаюць у ступар...

**Некаторыя заяўнікі спадзяюцца, што дастаткова зверху «націснуць» — і на месцах зробяць так, як «паложана».**

Сваёй заклапочанасцю з гэтай нагоды падзяліўся і дырэктар ААТ «Старыца-Агра», дэпутат Мінскага абласнога Савета Уладзімір Рудакоўскі:

— Ніхто не супраць дапамагаць людзям, і наша гаспадарка робіць гэта пастаянна, асабліва калі чалавек не лайдак, калі ён можа і хоча працаваць... Але некаторыя, даруйце, пачынаюць паводзіць сябе проста нахабна: «Вы мне павінны! Вы абавязаны!» Вось адзін з апошніх прыкладаў. Дамовіліся з людзьмі, што збіраем ураджай спачатку на грамадскіх палетках, а потым, пасля 20 верасня, выдзяляем камбайн згодна са спісам для індывідуальных патрэб... Справядліва? Так. Але адзін разумнік прыехаў да мяне 15 верасня і пачаў «качаць правы»: нічога не ведаю, дапамажыце ўбраць участак, а то буду звяртацца да Прэзідэнта, да сталічнага мэра... Ну звяртайцеся, кажу, ваша права.



*Дырэктар ААТ «Старыца-Агра» Уладзімір РУДАКОЎСКІ.*

Уладзімір Анатольевіч Рудакоўскі з катэгорыі тых кіраўнікоў, якія шмат робяць для сваіх падначаленых, але шмат і патрабуюць. Сярэдняя зарплата ў «Старыцы-Агра» сёння раўняецца 477 тысячам рублёў. Але ёсць работнікі, якія атрымліваюць па мільёну і больш. А ёсць такія, для якіх 140 тысяч — мяжа магчымасцяў. Па вялікім рахунку, апошнія — гэта «баласт», ад якога трэба пазбаўляцца. Таму што сельскагаспадарчае прадпрыемства — складаны механізм, у якім кожны «вінцік» павінен прыносіць максімальную аддачу.

— Добрага работніка ніхто ніколі не звольніць і не пакрыўдзіць. Ну а дрэнны... няхай скардзіцца. Думаю, з яго скаргай хутка разбяруцца і прыйдуць да высновы, што яна неабгрунтаваная, — лічыць Уладзімір Рудакоўскі.

Не так даўно, расказвае Уладзімір Анатольевіч, жанчына напісала скаргу ў камітэт дзяржкантролю — ажно на 7 лістах. Прычым падчас збору подпісаў давала аднавяскоўцам чытаць выключна першую і апошнюю старонкі, дзе гаворка ішла ўсяго толькі аб неабходнасці павялічыць ёй пенсію. Людзі чыталі і думалі: ну чаму б не дабавіць чалавеку грошай? — і падпісваліся пад напісаным... У выніку панаехала правяраючых — з раёна, з вобласці, са сталіцы... Паказалі вяскоўцам поўны тэкст пісьма — яны за галаву схапіліся: мы такое не падпісвалі! Пачалася праверка — ні адзін факт не пацвердзіўся.

Калі б гэта пісьмо легла спачатку на стол старшыні сельскага Савета, многіх непаразуменняў удалося б пазбегнуць. І ўжо дакладна зберагчы працоўны час работнікаў шэрагу інстанцый. Не кажучы пра нервовыя клеткі...

**Наталля КАРПЕНКА.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**
*Капыльскі раён.*

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

# ХТО РАЗЛІЧЫЦЦА З ЭНЕРГАЗБЫТАМ?

**Таццяна Пашкоўская, тэхнік Валожынскага ўчастка Энергазбыту, па прычыне сваіх службовых абавязкаў стала назіральнікам і сведкай цікавай сацыяльнай з'явы. За апошнія некалькі гадоў у раёне, асабліва на тэрыторыі бліжэйшых да Мінска Ракаўскага і Івянецкага сельсаветаў, расце колькасць так званых бамжоў — людзей без пэўнага месца жыхарства. Але апошнія якраз маюць уласнае жыллё, толькі плаціць за электрычнасць адмаўляюцца. Таму вярнуць грошы Энергазбыту за пастаўленую несумленнаму абаненту электраэнергію практычна немагчыма. Бо бамжы (так, дарэчы, іх завуць і інспектары энергазбыту) іх не маюць.**

Таццяну Мікалаеўну непакоіць той факт, што падчас кожнай планавай праверкі інспектары Энергазбыту знаходзяць двух—трох кандыдатаў з ліку «новых» вяскоўцаў на адключэнне ад лініі. Сёлета іх стала яшчэ больш. Такім чынам, статыстыка работнікаў Энергазбыту — няхай і ўскосна — сведчыць аб тэндэнцыі перасялення ў вёску на пастаяннае жыхарства не лепшых прадстаўнікоў горада.

«Новыя» вяскоўцы часам сваім прыездам ставяць у складанае становішча і мясцовую ўладу. Начальнік Валожынскага ўчастка Энергазбыту Васіль Жаровін расказвае, як яму патэлефанаваў старшыня Сугваздскага сельскага Савета: у адну з вёсак прыехала шматдзетная армянская сям'я. Як бы дом, дзе яна пасялілася, падключыць да электралініі? «Не пытанне. Напішыце нам пісьмо з гарантыяй аплаты за энергію на выпадак раптоўнага ад'езду сям'і», — адказаў Жаровін.

Старшыня, натуральна, адмовіўся даць гарантыі, і на тым размова скончылася. Неўзабаве Жаровін даведаўся, што армяне самастойна, без электралічыльніка, падключыліся да лініі... У іх — чацвёра дзяцей. Бацька афіцыйна нідзе не працуе, кажуць, перабіваецца часовымі заробкамі, маці таксама. Супрацоўнікі Энергазбыту маюць поўнае права адключыць святло, аштрафаваць іх і г.д. Але сям'я шматдзетная. І пайсці на такі крок было б не вельмі гуманна. Пакуль ідуць пошукі спонсара, расце доўг за спажытую, а дакладней, скрадзеную «новымі» армянскімі вяскоўцамі энергію.

Паводле прызнання старшыні аднаго сельскага Савета, «новыя» вяскоўцы ў большасці сваёй не выклікаюць асаблівых клопатаў у мясцовай улады. Звычайна гэта ціхія п'яніцы без праяў агрэсіі. На іх часцей звяртаюць увагу інспектары Энергазбыту — у час праверак. Калі даўгі назапашваюцца значныя, апошнія ідуць у сельсавет. І там нярэдка высвятляюцца непрыемныя падрабязнасці з біяграфіі перасяленцаў. Часцей за ўсё гэта... наяўнасць непад'ёмных даўгоў, якія назапашваліся не адзін год. Урэшце перад чалавекам або сям'ёй рубам паўстае пытанне: дзе ўзяць грошы.

Асабліва, паводле слоў работнікаў участка Энергазбыту, шмат неплацельшчыкаў-бамжоў у ракаўскай зоне раёна. З'яўляцца яны пачалі некалькі гадоў таму. Ці то самі яны прадалі свае гарадскія кватэры і на грошы, якія засталіся пасля разлікаў за даўгі, набылі больш-менш прыстасаваныя для жылля вясковыя хаты. Ці то іх перасялілі з горада за асацыяльныя паводзіны і хранічную шматгадовую запазычанасць па кватрплаце... Самыя нахабныя пасля ад'езду электрыкаў самастойна падключаюцца да электралініі. Як караць такіх? Зноў выкрываць? Але гэта дадатковыя выдаткі на прыезд інспектара і электрыкаў, у якіх і так клопатаў шмат.

За гэты год агульная запазычанасць за электраэнергію фізічных асобаў на ўчастку невялікая — на 1 кастрычніка яна складала 1206 кілават. Але калі ўзняць даўгі за мінулы і пазамінулыя гады, то атрымліваецца круглая сума. Перспектывы на вяртанне грошай даволі цьмяныя. Хутчэй за ўсё, страты лягуць на бюджэт, бо суд не прымае заявы Энергазбыту аб спагнанні грошай з чалавека, у якога няма легальных крыніц даходаў: ні зарплаты, ні рахунку ў банку, ні пенсіі. Нярэдка ў іх няма пашпарта, прапіскі ў вёсцы, пераафармленых дакументаў на дом.

**Нярэдка ў іх няма пашпарта, прапіскі, дакументаў на дом.**

Зразумела, работнікі энергазбыту звяртаюцца па падтрымку ў сельскія Саветы. Там не супраць дапамагчы, і ў большасці выпадкаў дапамагаюць — індывідуальна працуюць з неплацельшчыкамі. Сярод іх нямала дачнікаў — тых, хто набыў домік у вёсцы з мэтай адпачынку. Значная іх частка элементарна забывае своечасова разлічвацца за электраэнергію. З надыходам халадоў зачынілі хаты і з'ехалі, а даўгі за сезоннае спажыванне энергіі засталіся. Вось тут работнікі сельвыканкамаў і дапамагаюць адшукаць мінскія каардынаты «дачнікаў», тым самым аказваючы вялікую паслугу Энергазбыту. Калі не ўдаецца пераканаць неплацельшчыкаў на словах, выкарыстоўваюцца штрафныя санкцыі, адключэнні ад электралініі і як апошняя мера — матэрыялы праверак перадаюцца ў суд.

Даволі часта і законапаслухмяныя гараджане, якія набылі домік у вёсцы, не звяртаюць увагі на стан электраправодкі. А дарэмна. З пункту гледжання пажарнай бяспекі старое, а тым больш трухлявае жыллё ўяўляе сабой бомбу запаволенага дзеяння. Васіль Жаровін гаворыць, што 90 працэнтаў вясковага жыллёвага фонду мае зношаную праводку, не прыдатную для эксплуатацыі. Пракладзена яна была ў 50-х гадах мінулага стагоддзя і ўжо выпрацавала свой рэсурс. Асабліва небяспечная праводка, якая знаходзіцца звонку. У выніку ў вясковых дамах старой забудовы пастаянна знікае святло, псуюцца электралічыльнікі.

Акрамя таго, вяскоўцы набываюць пральныя машыны, мікрахвалевыя печы, пыласосы, бойлеры для падагрэву вады, і ўся гэта тэхніка нярэдка дае невыносную нагрузку на старую праводку. У выніку то пробкі выгараць, то лічыльнік сапсуецца... Але пра замену праводкі мала хто задумваецца.

Так што хваляванні работнікаў Валожынскага ўчастка Энергазбыту можна зразумець. З аднаго боку, арганізацыя павінна змагацца за эканомію электрычнасці. З іншага, Энергазбыт аказвае платныя паслугі насельніцтву па пастаўках энергіі і яму, згодна з планамі на наступны год, трэба на 14 працэнтаў павялічыць збор грошай.

Адзін з рэзерваў — скарачэнне запазычанасці за энергію, барацьба з яе раскраданнем. Праўда, работа з раскрадальнікамі — занятак даволі рызыкоўны. Схопленыя за руку могуць абразіць кантралёра, а то і накінуцца з кулакамі...

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**
*Валожынскі раён.*

# ПАРАЗМАЎЛЯЙ СА МНОЙ, УЛАДА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Але на працягу года бывае шмат пазаштатных сітуацый, на вырашэнне якіх трэба адшукваць пазабюджэтныя сродкі. Гэта даволі важны аспект, паколькі якраз па прычыне недахвату апошніх людзі часта скардзяцца. А між тым, калі ўлады не маюць магчымасці адшукаць пазабюджэтныя сродкі і вырашыць праблемы грамадзян, то вельмі важна растлумачыць ім, калі можа быць выпраўлена сітуацыя або чаму такой магчымасці не ўяўляецца. Уладам трэба праяўляць гібкасць. Некаторыя так сябе і паводзяць. Напрыклад, старшыня Глыбоцкага райвыканкама. Згодна з графікам, ён разам з намеснікамі і прадстаўнікамі ўсіх службаў — дарожнай, аховы здароўя, адукацыі, гандлю, унутраных спраў і г.д. прыязджае ў пэўны сельсавет. Усе жыхары вёсак, якія ўваходзяць у склад гэтага сельсавета, запрашаюцца на сустрэчу, напрыклад, у Дом культуры, дзе старшыня расказвае пра асноўныя вынікі развіцця раёна, аб перспектывах. Слова прадастаўляецца ўсім іншым удзельнікам, пасля чаго прадстаўнікі ўлады адказваюць на пытанні тутэйшага насельніцтва. Па выніках сустрэчы складаецца план рэалізацыі мерапрыемстваў для канкрэтнага сельсавета. Як вы думаеце, ці будуць скардзіцца і хадзіць па інстанцыях гэтыя людзі — інфармаваныя па ўсіх накірунках?

**— Але нельга выключыць магчымасці «злоўжывання» зваротамі. Мне здаецца, людзі не заўсёды адэкватна расцэньваюць сітуацыю і патрабуюць, што называецца «тое, што ім не належыць»...**

— Прадстаўнікам улады не трэба ісці на повадзе ў людзей, якія звяртаюцца да іх не па сутнасці. Калі канкрэтнае пытанне не ўяўляецца магчымым разгледзець у межах закона ці ў пэўных абставінах, то так і варта сказаць аб гэтым. Кожны выпадак павінен быць растлумачаны. Іншая справа, адзін чалавек з разуменнем успрыме сітуацыю, а нехта будзе браць чыноўнікаў штурмам. Некаторыя кіраўнікі ў падобных абставінах паводзяць сябе няправільна: яны, баючыся праверак і разборак, саступаюць.

У любым выпадку мясцовыя ўлады павінны мець на ўвазе дзве рэчы: па-першае, дзяржаўны чалавек абавязаны разважаць па-дзяржаўнаму, у межах заканадаўства, і, па-другое, дзяржаўны чалавек павінен разглядаць любое пытанне з улікам канкрэтных абставінаў, шукаць магчымыя шляхі і спосабы яго вырашэння. Безумоўна, людзям хацелася б, каб чыноўнікі разглядалі іх пытанні, як свае ўласныя.

**— З іншага боку, згодна з Указам, «прайшоўшыся» па ўсёй вертыкалі, я маю права звярнуцца ў суд. Сама такая магчымасць азначае, што не заўсёды органы ўлады дзейнічаюць з пазіцыі закона.**

— Калі чалавек не згодны з рашэннем канкрэтнага органа, то пасля разгляду пытання на ўзроўні, скажам, абласнога выканаўчага камітэта сапраўды можна звярнуцца ў суд. Вядома ж, як правіла, судовыя разборы пацвярджаюць кампетэнтнасць нашых чыноўнікаў. Але ёсць і іншыя прыклады, калі суд выносіць пастанову аб адмене рашэння выканаўчага органа. Таму сама магчымасць звароту ў суд павінна быць.

**— Вы сказалі, што ў нас даволі шмат заканадаўчых актаў для работы з грамадзянамі і іх зваротамі. Аднак ва Указе № 498 гаворыцца аб даручэнні кіраўніка дзяржавы па распрацоўцы адпаведнага Закона.**

— Гэта будзе адзіны комплексны Закон, куды трапіць уся нарматыўна-прававая база, якая датычыцца работы са зваротамі грамадзян.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## НЕЛЕГАЛЬНАЕ МЯСА

У Верхнядзвінскім раёне Віцебскай вобласці пры спробе нелегальнага вывазу 1,8 тоны мяса буйной рагатай жывёлы ў Расійскую Федэрацыю затрыманы два аўтамабілі, паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама.

Абедзве машыны былі спынены з перапынкам у некалькі гадзін супрацоўнікамі ДАІ на аўтадарозе Казьяны—Верхнядзвінск—мяжа Расійскай Федэрацыі. У першым аўтамабілі знаходзілася адна тона мяса на агульную суму каля Br4 млн. Суправаджальныя дакументы выклікалі сумненне ў супрацоўнікаў праваахоўных органаў, што стала падставай для затрымання грузу. Другі аўтамабіль перавозіў 800 кг мяса на агульную суму прыкладна Br3 млн, пры гэтым дакументы на груз адсутнічалі. Па гэтых фактах праводзяцца праверкі.

**Дзіяна КУРЫЛА, БЕЛТА.**

# ГЛАБАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ МЯСЦОВАГА МАШТАБУ



**Калі перад жыхарамі аграгарадка Жгунь Добрушскага раёна паўстала пытанне, каго выбраць старэйшынам, лепшай кандыдатуры, чым Леанід Іванавіч Радкевіч, не знайшлося. Сам Леанід Іванавіч родам з названай вёскі, бацькі яго працавалі ў мясцовай гаспадарцы і сыну параілі прыдбаць прафесію, якая была б звязана з зямлёй. Таму і паступіў некалі Радкевіч на заатэхнічны факультэт Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі.**

У сваім родным раёне браў адну пасадавую прыступку за другой. Спачатку быў галоўным заатэхнікам калгаса «Беларусь», што ў вёсцы Крупец, потым стаў намеснікам яго старшыні, а затым ужо ўзначаліў племзавод «Жгунскі», якому аддаў 16 гадоў свайго жыцця. Як чалавек няў-рымслівы, творчы, з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, Радкевіч вывеў гаспадарку ў лік першых не толькі ў вобласці, але і ў рэспубліцы. Пакінуў жа гэту пасаду 11 гадоў таму — з-за стану здароўя.

— Ведаеце, недарабіў я адну справу. Думка была пабудаваць у Жгуні спартыўны комплекс з плавальным басейнам. І часткова яна пачала ўжо рэалізоўвацца — у тым плане, што была знойдзена пляцоўка пад яго і распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя. На гэтым усё і заціхла: распаўся СССР, і ўжо стала не да комплексу, — расказвае Леанід Іванавіч. — Але гэту тэму я проста так не пакідаю. Як старэйшына аграгарадка, «мусірую» яе ў адпаведных інстанцыях. Спадзяюся, што агульнымі намаганнямі яна нарэшце будзе рэалізавана.

Калі б толькі адно такое, як гаворыцца, глабальнае пытанне хвалявала старэйшыну Жгуні... Вось, напрыклад, на вуліцы Рабочай своечасова не быў пакладзены асфальт, а людзі пытаюцца: чаму? А Радкевіч турбуе начальніка рамонтна-будаўнічага ўпраўлення Анатоля Горбеня. Адначасова і запыт яму робіць наконт гравійнай падсыпкі на вуліцы Маладзёжнай, дзе пабудавана дзесяць дамоў па прэзідэнцкай праграме. (Дамоўленасць, дарэчы, ужо дасягнута.)

Яшчэ адзін маршрут — да былых воінаў-афганцаў Сяргея Гуцава і Ігара Зуба: ім неабходна дапамагчы паставіць каля дамоў прыгожыя агароджы... У Жгуні пражывае звыш тысячы чалавек. І няма ніводнага, якога б не ведаў старэйшына Радкевіч. Асаблівы клопат — навядзенне парадку на вуліцах, на прысядзібных участках. На добраўпарадкаванне мабілізуюцца і старыя, і малыя.

Расказ пра старэйшыну Леаніда Радкевіча будзе няпоўным, калі не прыгадаць, што ён наладжвае сустрэчы школьнікаў з ветэранамі працы і вайны, ды і сам выступае перад моладдзю. А якое свята вёскі арганізавалі з работнікамі сельсавета ў верасні!

Адным словам, Леанід Іванавіч — у гушчыні жыцця і не ўяўляе сябе без гэтага.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

КАМАНДЗІРОЎКА ПА ПІСЬМУ

# ЖЫВЁМ ДОБРА, АЛЕ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

## Слова — за райпа

У спісе работ па падрыхтоўцы да адкрыцця аграгарадка добраўпарадкаванне займае ці не першае месца. У сваім лісце Ніна Сямёнаўна ўзгадвае тэрыторыю рынку ў цэнтры вёскі, якая «псуе ўвесь выгляд». Сапраўды, на плошчы, адведзенай некалі пад рынак, сёння пануе запусценне. Драўляныя хаткі-павільёны і столікі з навесамі прагнілі. Два цагляныя будынкі (у адным меркавалася праводзіць закупку ў насельніцтва грыбоў і ягад, у другім — вэндзіць мяса) захаваліся лепш, але ім патрэбны капітальны рамонт. Уся карціна ў цэлым ніяк не ўпісваецца ў паняцце аграгарадка.

— Мы неаднаразова выходзілі на раён з прапановай знесці рэшткі пабудоў рынку, — тлумачыць Таццяна Босая. — Ён усё роўна незапатрабаваны. Выязны рэчавы кірмаш, які ладзіцца ў нас кожную суботу, размяшчаецца за межамі гэтага рынку, а яго тэрыторыя пустуе.

Рынак з усімі яго пабудовамі знаходзіцца ў ведамстве Стаўбцоўскага райспажыўтаварыства, і адпаведнае рашэнне аб яго зносе ці рэканструкцыі павінна прыняць гэта арганізацыя.

Паводле слоў старшыні сельвыканкама, ліквідацыя рынку ніяк не адаб'ецца на забяспечанасці насельніцтва спажывецкімі таварамі. Па суботах у вёсцы працуе рэчавы кірмаш. Акрамя таго, у Дзераўной добра пастаўлены стацыянарны гандаль: ёсць тут і харчовыя, і прамтаварныя магазіны. Адны належаць сістэме райпа, іншыя — індывідуальным прадпрымальнікам.

— Што датычыцца Дзераўной, праблем з забяспечанасцю прадуктамі ў нас няма, — адзначыла Таццяна Іванаўна. — Прывоз рэгулярны, асартымент разнастайны. А цэны, між іншым, ніжэй, чым у Мінску ці ў раённым цэнтры. Калі гаварыць пра астатнія вёскі, асабліва тыя, што абслугоўваюцца аўталаўкамі (такіх па сельсавеце 9), хацелася б, безумоўна, каб пералік прапануемых імі тавараў быў багацейшым. Ведаю, што ў некаторых іншых раёнах індывідуальныя прадпрымальнікі складаюць канкурэнцыю аўталаўкам райпа, развозячы прадукты па вёсках. У нас такога няма. З іншага боку, у маланаселеных пунктах асноўныя жыхары — пенсіянеры. Напрыклад, у Беламошшы з 11 жыхароў 8 даўно «пераселі» мяжу працаздольнага ўзросту. Пенсія ў іх невялікая. Што ім звычайна трэба? Малако, хлеб, макарона. Усім гэтым аўталаўка забяспечвае. Адзінае, чаго мы хочам дабіцца ад райпа, — змяніць месцы прыпынкаў аўталавак, перанесці іх бліжэй да хат, бліжэй да людзей.

У лісце Ніны Сямёнаўны апісваецца магазін, дзе на другім паверсе пустуе плошча. «Тут можна было б адкрыць аддзел гаспадарчых тавараў, чайную ці кафэ», — прапануе аўтар.

Такі магазін у Дзераўной знайшоўся: вялікі будынак, на першым паверсе якога месціцца харчовыя і гаспадарчыя тавары, а на другім — незанятая плошча. Належыць ён сістэме райпа і зараз там актыўна вядуцца рамонтныя работы. «Некалі другі паверх хацеў узяць у арэнду прадпрымальнік, але памер аплаты аказаўся для яго непад'ёмным, — працягвае экскурс у гісторыю Дзераўной Таццяна Босая. — Больш ніхто з падобнымі прапановамі на нас не выходзіў».

## ...І свайго цырульніка

Наракае Ніна Сямёнаўна на тое, што ў мясцовым СВК сталовая працуе толькі ў летні сезон. Была б яна адкрытая ўвесь год — туды ўсе хадзілі б харчавацца. Добра было б мець і сваю гасцініцу, мяркуе пенсіянерка. Яшчэ яе турбуе той факт, што не працуе калгасная лазня, дзе, паводле яе інфармацыі, збіраюцца адкрыць камбінат бытавога абслугоўвання.

— Сталовая СВК працуе пасезонна, гэта абумоўлена аб'ектыўнымі прычынамі, — тлумачыць Таццяна Іванаўна. — Зімой у СВК скарочаны працоўны дзень — да 15.00. Работнікам танней і зручней паабедаць дома. Тое ж датычыцца і астатніх вяскоўцаў (усяго ў Дзераўной пражывае 1541 чалавек). На сезоннасць работы сталовай у сельвыканкам ніколі ніякіх скаргаў не паступала. А прыезджых у нас няшмат. Трымаць пункт харчавання адкрытым круглы год нерэнтабельна. Што датычыцца гасцініцы, ПМК-74 якраз зараз праводзіць рэканструкцыю будынка свайго былога інтэрната. Плануецца, што там і будзе гасцініца.

Лазня ў Дзераўной ёсць — на 50 месцаў. Знаходзіцца яна на балансе камунальных службаў. А ў «калгаснай» лазні для сваіх работнікаў працуе душ.

Комплексны прыёмны пункт месціцца асобна. У яго будынку зараз рамонт, хоць сам пункт працягвае працаваць. Абслугоўванне праводзіцца згодна з графікам.

— У нас цырульнік выязны, — расказвае старшыня сельскага Савета, — а нам вельмі патрэбны свой, пастаянны. Асабліва вялікі попыт на яго паслугі ў час выпускных вечароў, па суботах, калі ладзяцца вяселлі і юбілеі.

Не задавальняюць Ніну Сямёнаўну высокія цэны на аказанне сельгаспаслуг насельніцтву. «Многія старыя людзі ўжо адмовіліся ад пасадкі бульбы. Вельмі дорага ўсё гэта абыходзіцца...». Але яна не ўказвае, хто канкрэтна працуе па такіх высокіх тарыфах, якія ёй не па кішэні. А чаму б калгасу не дапамагчы людзям выкапаць бульбу?

— Сёлета адзінокім і адзінока пражываючым СВК аказваў дапамогу: прадаваў бульбу па льготных цэнах — 110 рублёў за кілаграм. Усім жыхарам, хто звяртаецца ў СВК, гаспадарка дапамагае ва ўборцы бульбы і збожжа і расцэнкі на гэтыя работы выстаўляе невысокія. Прыватная асоба можа ўстанавіць за сваю працу любую цану, але СВК тарыфаў з галавы не бярэ, — зазначыла Таццяна Іванаўна. — СВК «Дзераўное» выдзяляе жыхарам сена, збожжа на корм скаціне. Не магу сказаць, што гаспадарка не дапамагае. Чым можа — абавязкова падтрымае.

КУПа на тэрыторыі сельсавета няма: паводле слоў старшыні, ён быў бы нерэнтабельным. Затое другі год дзейнічае ўчастак ЖКГ. Праўда, спецтэхнікі там не хапае, таму ў аказанні сельгаспаслуг насельніцтву галоўную ролю па-ранейшаму адыгрывае СВК. Акрамя таго, у многіх вяскоўцаў сёння ёсць уласны трактар.

* * *

Безумоўна, у Хатаўскога сельсавета, як і ў любога іншага, ёсць свае праблемы. Таццяна Іванаўна іх і не хавае. Шмат чаго яшчэ хацелася б зрабіць па добраўпарадкаванні, але львіную долю ўсіх выдаткаваных на гэта сродкаў «паглынула» вулічнае асвятленне. З 20 млн рублёў, закладзеных пад добраўпарадкаванне ў мясцовы бюджэт, пасля разлікаў за электрычнасць засталося каля 400 тысяч. Іх накіравалі на ўстаноўку новага штыкетніка ўздоўж цэнтральных вуліц. Недахоп сродкаў перашкаджае весці работы і па рэалізацыі Дырэктывы № 3 — не змаглі ўстанавіць рэле часу, якія значна больш эканомныя за фотарэле. Праўда, пакуль рыхтаваўся матэрыял, на аграгарадок выдзелілі неабходныя рэле. Засталося забяспечыць імі астатнія вёскі сельсавета. Апоры (слупы) не прызначаны для малаватных лямпачак — і яны перагараюць літаральна праз суткі. Замена апор — справа РЭСа, аднак рукі ў іх да Хатаўскога сельсавета, відаць, яшчэ не дайшлі.

**Інга МІНДАЛЁВА.**
*Стаўбцоўскі раён.*

**ЗАСНАВАЛЬНІКІ:**
**САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,**
**ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,**
**УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»**

**ГРАМАДСКІ САВЕТ:**
**МАЛАФЕЕЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;
**САСОНКА М. П.,** старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;
**СЯЛІЦКІ В. С.,** старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;
**СІВАКОЎ В. А.,** старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;
**ЯРКОВІЧ В. І.,** старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

**АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.**
*Кантактны тэлефон 292 21 03.*

# Краіна здароўя

Выпуск № 34 (47)

## Бацькі 370-тысячнага жыхара Магілёва атрымаюць у падарунак Br31 млн

**У Магілёве з'явіўся на свет 370-тысячны жыхар горада. Ім стала дачка сямейнай пары Наталлі і Уладзіміра Гаўрылавых, якую яны назвалі Веранікай, паведамілі ў Магілёўскім гарвыканкаме.**

Згодна з рашэннем гарвыканкама бацькі атрымаюць падарунак у памеры 1000 базавых велічынь, або Br31 млн. Акрамя таго, ад удзельнікаў міжнароднага фестывалю «Свет мёду і здароўя», які праходзіць у гэтыя дні ў Магілёве, ім будзе ўручана 100-кілаграмовая бочка мёду.

Плануецца, што ў гарадскім ЗАГСе 15 лістапада з нагоды з'яўлення на свет юбілейнага жыхара Магілёва пройдзе ўрачыстае мерапрыемства з удзелам кіраўніцтва і грамадскасці абласнога цэнтра.

**Сяргей КУЛЯГІН, БЕЛТА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ДЗЕЦЯМ — ДЗІЦЯЧЫЯ ЛЕКІ!

Нягледзячы на вялікую патрэбу, на сённяў фармацэўтычнай практыцы выкарыстоўваецца зусім невялікая колькасць лекавых сродкаў, якія маюць дзіцячыя лекавыя формы і дозы і могуць з лёгкасцю выкарыстоўвацца для лячэння дзяцей. Таму дзеці вымушаны прымаць часткі разламаных таблетак, прызначаных для дарослых, з нізкай даказанай эфектыўнасцю і бяспечнасцю для іх. Такая выснова прагучала на міжнародным семінары па фармацэўтычных распрацоўках, арганізаваным Міжнароднай фармацэўтычнай федэрацыяй Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Беларускую дэлегацыю на семінары прадстаўлялі супрацоўнікі Міністэрства аховы здароўя, Цэнтра экспертыз і выпрабаванняў у ахове здароўя, прадпрыемства «Фармтэхналогія» і Барысаўскага завода медыцынскіх прэпаратаў.

У Беларусі на 1 верасня 2007 года было зарэгістравана 5393 гандлёвыя назвы лекавых сродкаў (без уліку фармацэўтычных субстанцый). Пры гэтым толькі ў 20 прэпаратаў у назве прысутнічала слова «дзіцячы», гэта значыць, што яны прызначаны выключна для дзіцячай лячэбнай практыкі. Яшчэ 500 назваў лекаў выкарыстоўваецца ў тым ліку і ў педыятрыі.

Некаторыя лекавыя сродкі даводзіцца гатаваць у аптэках з таблеціраваных формаў і фармацэўтычных субстанцый па заяўках арганізацый аховы здароўя, паколькі ў краіне не зарэгістраваны гатовыя лекавыя сродкі ў патрэбных дазіроўках.

Сусветная арганізацыя аховы здароўя агучыла свой пункт погляду на патрабаванні да лекавых сродкаў, што прымяняюцца пры лячэнні дзяцей, і ўзняла пытанне аб стварэнні спісу лекавых сродкаў, прызначаных для вылечвання дзяцей. Дзеці хварэюць на тыя ж хваробы, што і дарослыя, падкрэслівалася на семінары, але захворванні працякаюць у іх больш цяжка, асабліва такія, як інфекцыі дыхальных шляхоў і дыярэйныя захворванні.

— Падыходы Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь у цэлым адпавядаюць падыходам, якія выкарыстоўваюцца ў міжнароднай практыцы, — падкрэсліла начальнік аддзела арганізацыі лекавага забеспячэння Упраўлення фармацэўтычнай інспекцыі і арганізацыі лекавага забеспячэння міністэрства Наталля Малашка. — Пры будучым пераглядзе пераліку асноўных лекавых сродкаў мы плануем прадугледзець асобны раздзел «Лекавыя сродкі, што выкарыстоўваюцца ў педыятрыі».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

15 лістапада — Сусветны дзень некурэння

# 1 ЦЫГАРЭТА Ў ДЗЕНЬ — ДАЛОЎ АМАЛЬ 5 ГАДОЎ ЖЫЦЦЯ

**Здаровы сэнс павінен дапамагчы вам кінуць курыць або ніколі і не пачынаць.**

У нашай краіне рэгіструюцца два новыя прэпараты — пластыр і таблеткі — для аказання дапамогі залежным ад тытуню. Аднак і дагэтуль нарколагі выкарыстоўвалі дастатковую колькасць пілюль у спалучэнні з такімі метадамі, як іголкарэфлексатэрапія, акупунктура, псіхатэрапія. А замежныя спецыялісты раяць курцам яшчэ і як мага часцей уключаць у свой рацыён малочныя прадукты, садавіну і гародніну. Яны, як сцвярджаецца, зніжаюць «патрэбу» ў тытунёвым атручэнні. Тым не менш гаварыць аб адназначных поспехах гэтых мерапрыемстваў складана. Паводле слоў **галоўнага нарколага Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Уладзіміра МАКСІМЧУКА**, адзінага рэцэпта перамогі над шкоднай звычкай не існуе. Лепшы сябар у цяжкай справе — самасвядомасць, гарачае жаданне жыць як мага даўжэй.

Кожныя 8 секунд на планеце хтосьці гіне па прычыне курэння тытуню. Паводле даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, зараз курыць трэцяя частка ўсёй папуляцыі ва ўзросце ад 15 гадоў. У Беларусі — амаль палова дарослага насельніцтва. І гэтыя лічбы маюць тэндэнцыю да росту. Між тым, даказана, што тытунь забівае палову сваіх пастаянных спажыўцоў. Усе тытунёвыя вырабы з'яўляюцца канцэрагеннымі. Тытунёвы дым утрымлівае звыш 4 тысяч хімічных злучэнняў, з якіх 43 з'яўляюцца вядомымі канцэрагенамі, акрамя таго, у тытунёвым дыме ёсць злучэнні, якія спрыяюць фарміраванню канцэрагенаў у арганізме.

Відавочна, што курэнне прыводзіць да сур'ёзных парушэнняў здароўя, абумоўлівае павышаную рызыку наступлення інваліднасці і заўчаснай смерці. Курэнне абумоўлівае прыкладна 75 працэнтаў усіх выпадкаў хранічных бранхітаў і эмфізем лёгкіх, 35 працэнтаў выпадкаў ішэмічнай хваробы сэрца, з ім непасрэдна звязана 18 тыпаў новаўтварэнняў, сярод якіх рак ротавай поласці, глоткі, гартані, страваводу, страўніка, падстраўнікавай залозы, печані, нырак, мачаточніку, мачавога пузыра, шыйкі маткі, прастаты. Вядома, што з узнікненнем раку звязаны тры асноўныя фактары: узрост чалавека, фактары навакольнага асяроддзя і шкодныя звычкі, а таксама спадчыннасць. Пад неспрыяльнымі фактарамі навакольнага асяроддзя варта разумець курэнне, няправільнае харчаванне, неактыўны лад жыцця, атлусценне, пэўныя інфекцыйныя агенты (вірусы папіломы, гепатыту, ВІЧ і інш.), пэўныя віды лячэння (прамянёвая і хіміятэрапія), ультрафіялетавае абпраменьванне, канцэрагены, якія ўтрымліваюцца ў паветры, вадзе, глебе. Гэтыя фактары з'яўляюцца прычынай узнікнення раку ў 80 працэнтах выпадкаў, прычым абсалютная большасць выпадае на курэнне, няправільнае харчаванне, адынамію і атлусценне.

З курэннем звязана амаль 90 працэнтаў выпадкаў раку лёгкага. На сёння дакладна вызначаны генетычныя фактары спадчыннай схільнасці ў фарміраванні раку лёгкіх ў курыльшчыкаў. Як адзначае **галоўны навуковы супрацоўнік аддзела хіміятэрапіі Навукова-даследчага інстытута анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава Святлана ПЯТРОВІЧ**, у апошнія гады вырасла смяротнасць ад раку лёгкіх сярод жаночага насельніцтва шэрагу краін свету. Так, у ЗША жанчыны цяпер часцей паміраюць ад раку лёгкіх, чым ад раку малочнай залозы. У Германіі колькасць жанчын, якія захварэлі на рак лёгкіх, за апошнія 10 гадоў вырасла ўдвая. Несуцяшальныя прагнозы чакаюць і беларускіх жанчын-курцоў літаральна праз 10—15 гадоў.

Нічога добрага не нясе тытунёвы дым і для пасіўных курцоў. Паводле даных Нацыянальнага інстытута раку (ЗША), пасіўнае курэнне павышае рызыку злаякасных пухлін, у прыватнасці, лёгкіх і страваводу. У дзяцей, чые бацькі кураць, тытунь становіцца прычынай сіндрому раптоўнай смерці, пнеўманіі, бранхіту і бранхіяльнай астмы. 42-гадовыя назіранні за дзяўчынкамі ад моманту іх нараджэння ў сем'ях курцоў выявілі выпадкі наступлення ў іх інфаркту міякарда ва ўзросце 38 гадоў. 20-гадовыя назіранні за жанчынамі, якія пражываюць з курыльшчыкамі, паказалі рост частаты ўзнікнення сардэчна-сасудзістых хваробаў сярод іх амаль на 60 працэнтаў у параўнанні з тымі жанчынамі, чые партнёры па шлюбу не маюць дурной звычкі.

Як вядома, наша краіна сярод іншых падпісала Рамачную канвенцыю Сусветнай арганізацыі аховы здароўя па барацьбе супраць тытуню. Дакумент, у прыватнасці, прадугледжвае поўную забарону рэкламы тытунёвых вырабаў да 2010 года, забарону выкарыстання такіх тэрмінаў, як «лёгкія цыгарэты», вылучэнне большага месца на друк папярэджванняў аб шкодзе курэння на цыгарэтных пачках, забарону курэння ў грамадскіх месцах. Дакладныя тэрміны па ажыццяўленні падобнай работы яшчэ не вядомы, аднак пакрысе работа вядзецца.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

*Дарэчы*

# Пры прыёме на работу даведка аб тым, ці з'яўляецца чалавек курцом, не спатрэбіцца

**Міністэрства аховы здароўя Беларусі абвяргае чуткі аб распрацоўцы нарматыўна-прававога акта, які абавязвае пры прыёме на работу падаваць даведку аб тым, ці з'яўляецца чалавек курцом.**

«Цяпер пытанне аб распрацоўцы такога акта не ставіцца», — заявіў на сустрэчы з журналістамі галоўны нарколаг Міністэрства аховы здароўя Уладзімір Максімчук.

Ён нагадаў, што два гады таму міністэрствам быў выдадзены пералік прафесій, пры прыёме на работу на якія неабходна абавязкова прайсці агляд у нарколага. У яго, акрамя так званых «асабліва небяспечных» прафесій, былі ўключаны шафёры і бухгалтары. Рэакцыя грамадскасці на гэты дакумент спачатку была даволі неадназначнай, аднак з цягам часу змянілася на станоўчую.

Уладзімір Максімчук таксама паведаміў, што цяпер прапрацоўваюцца пытанні аб неабходнасці заканадаўчага замацавання некаторых абмежаванняў на продаж тытунёвых і алкагольных вырабаў. У прыватнасці, разглядаецца мэтазгоднасць забароны на продаж алкаголю асобам, якія не дасягнулі 21 года. Плануецца таксама зрабіць «больш агрэсіўнымі» надпісы, што расказваюць аб шкодзе курэння і ўжывання спіртных напіткаў, якія размяшчаюцца на пачках з цыгарэтамі і бутэльках са спіртным.

У мэтах прафілактыкі тытунекурэння міністэрствам і ведамствам рэкамендуецца ўводзіць заахвочвальныя меры для супрацоўнікаў за адмову ад гэтай шкоднай прывычкі. Міністэрствам аховы здароўя і Міністэрствам унутраных спраў выдадзены загады, якія прадугледжваюць адміністрацыйную і дысцыплінарную адказнасць для супрацоўнікаў за курэнне ў неналежных месцах. У адміністрацыйных будынках адводзяцца спецыяльныя месцы для курэння, у многіх кафэ ствараюцца асобныя залы для наведвальнікаў-курцоў і наведвальнікаў, якія не кураць.

**БЕЛТА.**

## «ЯГАДА ЗДАРОЎЯ Ў ШКОЛЬНЫМ САДЗЕ»

— такі адзін з дзесяці праектаў, якія прапанаваў пацярпелы ад чарнобыльскай трагедыі Чачэрскі раён Камітэту па падрыхтоўцы і ацэнцы праектаў Міжнароднай праграмы CORE. Савет па прыняцці рашэнняў камітэта паведаміў, што ён атрымаў права на жыццё ў Матнявіцкай школе раёна. Там на фінансавыя сродкі офіса АБСЕ і швейцарскага ўпраўлення па развіцці і супрацоўніцтве будзе закладзены сад, дзе пачнуць вырошчваць чарнаплодную рабіну (аралію) і парэчкі. Усе работы будуць выконвацца школьнікамі, што будзе садзейнічаць працоўнаму выхаванню і стварэнню вітамінных запасаў.

А мэрыя швейцарскага горада Іцінген выдзеліла гораду Добрушу, з якім сябруе 15 гадоў, грошы для абсталявання студыі гуказапісу раённага Дома культуры. Яно (а гэта — камп'ютар з прафесійнай гукавой карткай, міні-пульт, студыйныя мікрафоны і г.д.) ужо набыта і апрабавана на канцэрце.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

# Звяртаемся ў паліклініку толькі калі захварэем...

**Толькі 17 працэнтаў зваротаў да ўрачоў першаснага звяна маюць прафілактычныя мэты, а 83 працэнты — абумоўленыя неабходнасцю аказання пацыентам лячэбнай дапамогі пры вострых захворваннях ці абвастрэннях, выпісваннем ім даведак і рашэннем пытанняў непрацаздольнасці.**

З 2007 года ў нашай краіне распачалася дыферэнцаваная дыспансэрызацыя насельніцтва, гэта значыць з улікам фактараў рызыкі ў розных узроставых групах і сярод розных кантынгентаў. У першую чаргу дыспансэрызацыя скіраваная на ранняе выяўленне і эфектыўнае лячэнне сардэчна-сасудзістых, анкалагічных захворванняў, захворванняў апорна-рухальнага апарату, цукровага дыябету і туберкулёзу, якія з'яўляюцца асноўнымі прычынамі смяротнасці і інваліднасці працаздольнага насельніцтва.

Для таго, каб зрабіць спецыялізаваную дапамогу больш даступнай для пацыентаў, а выкарыстанне дарагой апаратуры і высокакваліфікаваных кадраў больш эфектыўнымі, сёння ў амбулаторна-паліклінічных установах ствараюцца цэнтры калектыўнага карыстання медыцынскай тэхнікі. Акрамя таго, распрацавана Канцэпцыя развіцця высокатэхналагічных метадаў абследаванняў і лячэння хворых на 2007—2010 гады.

На думку намесніка начальніка ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Людмілы Жылевіч, укараненне ў кожнай паліклініцы вымярэння агульнага халестэрыну ўсім асобам пасля 40 гадоў, укараненне Еўрапейскай сістэмы Score для вызначэння рызыкі ішэмічнай хваробы сэрца і сардэчна-сасудзістых ускладненняў і правядзенне скрынінгавых абследаванняў асобаў з фактарамі рызыкі развіцця ішэмічнай хваробы сэрца маглі б істотна палепшыць прафілактыку і дыягностыку захворванняў сістэмы кровазвароту.

Не менш важнае значэнне мае і «выхаванне» анкалагічнай насцярожанасці ва ўчастковых урачоў. На першае месца тут выходзіць ранняя дыягностыка раку малочнай залозы — гэта на сёння адна з самых распаўсюджаных формаў раку. Урачы павінны забяспечваць максімальную даступнасць дыягностыкі пры звароце да іх пацыентаў, у тым ліку мамаграфічны і ўльтрагукавы скрынінг, актывізаваць работу анкалагічных школ і навучаць жанчын метадам самаабследавання малочных залозаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ЛЯЧЫЦЬ БУДУЦЬ КІТАЙСКІЯ ЮАНІ

У колькасці трыццаці іх мільёнаў. А гэта ў эквіваленце чатыры мільёны амерыканскіх долараў. Такая сума ўрада Кітая перададзена Гомельскаму абласному кардыялагічнаму дыспансэру. На іх будзе закуплена найноўшае медыцынскае абсталяванне і ўзведзены новы корпус, дзе з'явяцца дзве сучасныя аперацыйныя. Тым самым будзе дасягнута пастаўленая мэта — рабіць за год да тысячы аперацый на адкрытым сэрцы.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## Новая «зброя» супраць прастуды

**З чарговай навінкай напярэдадні сезона прастудных захворванняў выходзіць на айчынны фармацэўтычны рынак вытворчае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Мінскінтэркапс».**

Яго новы прэпарат «АнГрыМакс» прызначаны для лячэння грыпу, вострых рэспіраторных захворванняў і ліхаманкавага стану, выкліканага вірусным паражэннем дыхальных шляхоў. Дзякуючы кампанентам, што ўваходзяць у яго склад, ён валодае процівіруснымі, жарапаніжальнымі, процізапаленчымі, абязбольвальнымі, антыгістаміннымі і ангіяпратэктарнымі ўласцівасцямі. Так, напрыклад, рэмантадзін, які ўваходзіць у«АнГрыМакс», гэта добра вядомы процівірусны сродак, эфектыўны ў адносінах да розных штамаў віруса грыпу А. Парацэтамол — процізапаленчы сродак, які змяншае боль у горле, галаўны, мышачны і сустаўны боль і зніжае высокую тэмпературу цела. Аскарбінавая кіслата ўдзельнічае ў рэгуляванні акісляльна-аднаўленчых працэсаў і валодае выражанымі антыаксідантнымі ўласцівасцямі. Лоратадзін валодае проціалергічным уздзеяннем, папярэджвае развіццё ацёкаў тканак і ўхіляе спазмы гладкай мускулатуры. А руцін з'яўляецца ангіяпратэктарам, папярэджвае развіццё павышанай пранікальнасці і ломкасці сасудаў, якія абумоўліваюць гемарагічныя працэсы пры грыпе, а таксама аднаўляе капілярны кровазварот і ўмацоўвае сасудзістыя сценкі.

Застаецца дадаць, што прэпарат «АнГрыМакс» выпускаецца ў жэлацінавых капсулах (па 20 капсул ва ўпакоўцы) і прызначаны для лячэння дзяцей ва ўзросце пасля 6 гадоў і дарослых.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Да ўвагі*

# ЦІ ХАПАЕ Ў ВАС ЁДУ?

**Вучоныя Гродзенскага філіяла НВЦ «Інстытут фармакалогіі і біяхіміі» Нацыянальнай акадэміі навук распрацавалі экспрэс-тэст для кантролю ёднай забяспечанасці, паведаміла супрацоўнік аддзела біярэгулятараў інстытута Лілія Надольнік.**

Паводле слоў спецыяліста, экспрэс-тэст прызначаны для індывідуальнага кантролю ёднай забяспечанасці ў людзей як у медыцынскіх установах, так і ў хатніх умовах. Распрацоўка можа таксама выкарыстоўвацца для ацэнкі эфектыўнасці дзеяння прэпаратаў, якія змяшчаюць ёд. «Тэст забяспечвае высокую адчувальнасць і дакладнасць вымярэнняў, — адзначыла яна. — Гэта дапамагае вызначаць лёгкую, сярэднюю і цяжкую ступені ёдадэфіцыту ў пацыентаў». Выкарыстанне распрацоўкі дапаможа значна спрасціць і паскорыць працэс абследавання вялікай колькасці людзей пры правядзенні эпідэміялагічных даследаванняў.

Экспрэс-тэст просты ў выкарыстанні. У выпадку дэфіцыту або лішку ёду ў арганізме чалавека палоска тэста мяняе колер пры кантакце з мачой. Працэдура займае да 7 хвілін. Распрацоўка асабліва важная для дзяцей і цяжарных жанчын — парушэнне ёднай забяспечанасці ў іх можа выклікаць сур'ёзныя захворванні. Выкарыстанне тэста дапаможа знізіць рост паталогій шчытападобнай залозы ў гэтых груп насельніцтва.

Часта людзі з ёднай недастатковасцю бескантрольна прымаюць ёдазмяшчальныя прэпараты. «Залішняе спажыванне ёду аказвае негатыўны ўплыў на арганізм чалавека і можа прывесці да парушэння функцый шчытападобнай залозы, — патлумачыла спецыяліст. — Наша распрацоўка дапаможа пацыентам пастаянна кантраляваць утрыманне ў арганізме ёду і пры неабходнасці нармалізаваць яго колькасць».

Лілія Надольнік таксама паведаміла, што зараз НВЦ «Інстытут фармакалогіі і біяхіміі» НАН распрацоўвае новыя лекавыя прэпараты для лячэння ёднай недастатковасці. «Напрыклад, для дзяцей мы ствараем прэпарат не толькі з утрыманнем ёду, але і селену, калію, жалеза», — дадала яна. Комплекснае ўздзеянне гэтых кампанентаў дазволіць не толькі процістаяць захворванням шчытападобнай залозы, але і ўмацаваць дзіцячы арганізм.

**Вольга БЯЛЯЎСКАЯ, БЕЛТА.**

*Лячыцца з розумам*

# ЗНОЎ ГЭТЫ ГЕРПЕС. НАДАКУЧЫЛА

**Паводле звестак сусветнай арганізацыі аховы здароўя, ад 95 да 99 працэнтаў насельніцтва ўсёй планеты інфіцыраваны вірусамі герпесу.**

**Гэта звязана з пагаршэннем экалагічнай сітуацыі, зніжэннем ахоўных магчымасцяў арганізма і развіццём другаснага імунадэфіцыту. Герпес вельмі разнастайны ў сваім праяўленні. Аб яго асаблівасцях, наступствах, правілах прафілактыкі і лячэнні нам расказаў загадчык амбулаторнага дэрматавенералагічнага аддзялення № 4 Мінскага гарадскога клінічнага скурна-венералагічнага дыспансэра Уладзімір Яроміч.**

Хоць носьбітам віруса герпесу з'яўляецца большасць насельніцтва планеты, аднак клінічныя праявы хваробы ёсць зусім не ва ўсіх. Толькі ад 5 да 15 працэнтаў людзей маюць нейкую клініку герпесу.

Неўскладненыя герпевірусныя захворванні працякаюць у выглядзе скрытай хранічнай і вострай формаў. Клінічныя праявы ўзнікаюць на слізістай абалонцы або скуры, могуць лакалізавацца на вуснах (так званая ліхаманка на вуснах), геніталіях.

На месцы паражэння вірусам узнікае чырвоная плямка, на якой з'яўляецца высыпка ў выглядзе пухіркоў з празрыстым змесцівам. Пасля ўскрыцця пухіркоў застаюцца балючыя язвачкі, якія загойваюцца на 7—8-ы дзень і на месцы паражэння можа не застацца ніякага следу.

Аднак герпевірусы могуць стаць і прычынай сур'ёзных захворванняў. Герпес можа паражаць нерв вока і прыводзіць да слепаты, стаць прычынай невыношвання цяжарнасці. Ёсць яшчэ такое захворванне, як герпес зосцера (у народзе — апярэзваючы лішай). Пры гэтым пашкоджваецца скура і нервовая сістэма. Захворванне суправаджаецца высыпкамі ў выглядзе згрупіраваных пухіркоў з празрыстым, а потым і гнойна-крывавым змесцівам па ходу нерва. Прычым нават пасля загойвання ўсіх высыпак балявы сіндром можа захоўвацца да некалькіх месяцаў. І тут ужо спатрэбіцца кансультацыя неўрапатолага.

Герпес можа быць пярвічна ўзнікаючым і рэцыдывуючым. Гэты вірус паражае клетку чалавека, убудоўваючыся ў яго ДНК, потым пры дзяленні гэтай клеткі ДНК вірус передаецца разам з ДНК клеткі далей. Таму выдаліць герпевірусы з арганізма практычна немагчыма. Яны могуць паражаць любыя органы і сістэмы, бо жывуць у нервовых канчатках. Аднак выклікае вірус захворванне ці не — гэта ўжо як каму пашанцуе.

Хвароба можа передавацца паветрана-кропельным шляхам (пры размове, кашлі, пацалунку); палавым шляхам; у перыяд цяжарнасці ад маці да плода. Часцей за ўсё заражэнне адбываецца ад хворага да хворага. Але нават носьбіт віруса, які не мае выражаных праяў хваробы, можа інфіцыраваць іншага чалавека.

Правакуючымі фактарамі для ўзнікнення герпетычнай інфекцыі могуць быць нервовыя стрэсы, нейкія агульныя захворванні. Тая ж ліхаманка на вуснах часта з'яўляецца на фоне прастуды. Развіццю хваробы садзейнічае любы стан, які суправаджаецца імунадэфіцытам. Пераахаладжэнні і перагрэвы, алкаголь — усё гэта можа справакаваць праявы герпесу.

У людзей сталага ўзросту хвароба працякае цяжэй, бо з цягам часу арганізм зношваецца, яго адольваюць хваробы, імунітэт зніжаецца.

А вось у падлеткаў больш правакуючых фактараў. Сучасныя павевы ў адзенні — кароткія камізэлькі, спадніцы і г.д. — даволі хутка прыводзяць да пераахаладжэння. А гэта правакуючы момант. Даволі актыўнае захапленне моладзі алкаголем, нават лёгкім півам можа прывесці да аслаблення імуннай сістэмы. Акрамя таго, многія маладыя людзі не вельмі пераборлівыя ў палавых сувязях.

Зараз рэкламуецца шмат прэпаратаў, якія быццам бы хутка пазбаўляюць ад герпевіруснай інфекцыі. Ці азначае гэта, што ад надакучлівай балячкі можна пазбавіцца самастойна, пры дапамозе сучасных цуд-мазяў?

— Я не раіў бы гэтага рабіць. Усё ж лепей звярнуцца да ўрача-дэрматавенеролага, каб атрымаць паўнацэннае комплекснае лячэнне, — зазначае У. Яроміч, — асабліва калі рэцыдывы бываюць даволі часта. Мала таго, што чалавек адчувае боль, дык у яго з'яўляецца псіхалагічны дыскамфорт, пагаршаецца якасць жыцця. Акрамя таго, вірус паражае не толькі тую частку, дзе ён з'яўляецца, а можа мігрыраваць, пераходзіць ад аднаго органа на другі, выклікаць новыя захворванні. Таму не заўсёды дастаткова выкарыстоўваць вонкава нейкую мазь. Тут можа быць сістэмнае выкарыстанне супрацьвірусных прэпаратаў або комплексная імунатэрапія. Лячэнне падбіраецца з улікам таго, якія ў пацыента высыпкі: пярвічныя або рэцыдывуючыя, як часта рэцыдывы ўзнікаюць. У аднаго гэта можа быць раз у паўгода, у другога — раз у год, у трэцяга — раз у месяц. Задача — дабіцца таго, каб пасля лячэння, нават першага эпізоду, хвароба па магчымасці ўвогуле далей не турбавала або хоць бы зрабіць так, каб рэцыдывы былі як мага радзей. Сучасныя схемы метадаў лячэння ёсць, але падбіраюцца яны індывідуальна.

**Неабходна прытрымлівацца агульных правілаў прафілактыкі для папярэджання захворванняў на герпес:**

- Не цалуйце сваё дзіця ў вусны — большасць малых заражаюцца герпесам ад бацькоў.
- Захоўвайце правілы асабістай гігіены. Індывідуальнымі павінны быць не толькі мыла і мачалка, але і памада для вуснаў. Адзін раз правялі чужой памадай па вуснах — і расплачвацца будзеце гадамі.
- Арганізм неабходна насыціць вітамінамі і мікраэлементамі, таму ўжывайце больш садавіны і гародніны.
- Важную ролю адыгрывае загартоўванне.

Правільнае харчаванне — залог выдатнай работы імуннай сістэмы. Сучасныя навуковыя даныя сведчаць аб тым, што шэраг харчовых прадуктаў можа правакаваць рэцыдывы герпесу. Тлустая ежа, багатая на халестэрын, цукар, алкаголь, — прычына частых герпетычных высыпак. Цукар замаруджвае ўсмоктванне ў кішэчніку вітаміну В і С, што вядзе да зніжэння імунітэту. Алкаголь аказвае прамы таксічны ўплыў на імунныя клеткі, халестэрын зніжае ўтварэнне лейкацытаў.

Людзям, якія пакутуюць ад герпесу, рэкамендуецца прытрымлівацца дыеты з павышанай колькасцю ў харчовых прадуктах незаменнай амінакіслаты — лізіну, якая зніжае частату рэцыдываў.

Для хворых на герпес шкодныя арахіс і шакалад, разынкі, некаторыя збожжавыя культуры, асабліва на аснове пшаніцы. Яны павінны звесці да мінімуму ўжыванне свініны і ялавічыны, а мазгі — увогуле выключыць з рацыёну. І наадварот, карыснымі з'яўляюцца белае мяса курыцы, рыба, бабовыя, яйкі.

Стымулюючы эфект на імунную сістэму аказваюць і раслінныя экстракты: настойка элеўтэракону, карані жэньшэню, залатога кораня, мумiё, экстракт туі, пантакрын. Яны павялічваюць выпрацоўку белых крывяных цельцаў, паскараюць працэс абнаўлення пашкоджаных клетак. Ужыванне гэтых сродкаў павялічвае працягласць безрэцыдыўнага перыяду.

**Вольга ШАЎКО.**

## ВІРУС СМЕРЦІ

Кожны год добраахвотна ідуць з жыцця каля 300 мінчан. Асноўныя прычыны, якія штурхаюць гараджан на суіцыд, дзве: нешчаслівае каханне і цяга да выпіўкі. На трэцім месцы — псіхічная хвароба. Зрэшты, у апошнія гады колькасць суіцыдаў у сталіцы змяншаецца. Так, у 2004 годзе іх было 393, у 2005-м — 332, а ў мінулым годзе — 286. Самымі распаўсюджанымі спосабамі звесці рахункі з жыццём застаюцца павешанне і падзенне з вышыні.

**Іна ПАЛЮХОВІЧ,**
*«Мінск-Навіны».*

## УПАЎ У КАЛОДЗЕЖ

**У вёсцы Шыповічы, што ў Кобрынскім раёне, прапаў 86-гадовы дзед. Калі сын пачаў шукаць яго, то звярнуў увагу на адкрытую накрыўку на калодзежы.**

Затым жэрдкай на дне студні людзі намацалі і цела старога.

Узровень вады быў высокі, і дзед загінуў. Было гэта самагубства ці няшчасны выпадак, высвятляе пракуратура.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

*Інфарм-укол*

## ВЫРАТАВАННЕ — У ВАКЦЫНАЦЫІ

**Галоўная асаблівасць віруса грыпу — высокая заразнасць. Да грыпу схільныя практычна 100 працэнтаў насельніцтва.**

Загартоўванне і вітаміны ўберагуць ад вострых рэспіраторных вірусных інфекцый, але не ад грыпу. Працістаяць вірусу грыпу можа толькі арганізм, які выпрацаваў антыцелы да яго. А гэта адбываецца, калі чалавек ужо перахварэў або зрабіў прышчэпку. Увесь цывілізаваны свет зрабіў выбар на карысць апошняга. Гэта перш-наперш танней, акрамя таго, у апошні час вакцыны становяцца ўсё больш бяспечнымі. Вакцыны апошняга пакалення наогул не ўтрымліваюць ні аслабленага віруса, ні яго часціц. У сучасным варыянце ёсць толькі кавалачак абалонкі, які ўтрымлівае антыгены, на іх і выпрацоўваюцца антыцелы. Кампанія па вакцынацыі супраць грыпу праводзіцца восенню. Пасля чаго на працягу года чалавек абаронены. Лепш рабіць прышчэпку 2—3 гады запар. А пасля варта пацікавіцца, які вірус чакаецца ў гэтым годзе. Калі той жа, што і летась, вакцынацыю можна прапусціць.

## АД ЧАГО ЗАЛЕЖЫЦЬ «СЭКСУАЛЬНАЕ ШЧАСЦЕ»?

**Усе нашы псіхалагічныя праблемы, у тым ліку ў сэксуальным жыцці, бяруць пачатак у раннім дзяцінстве і звязаны з нашымі бацькамі.**

У псіхалогіі ёсць тэрмін «імага» — гэта вобраз ідэальнага партнёра, які мы ствараем, калі арыентуемся на значных для нас дарослых, з кім бессвядома імкнёмся высветліць незавершаныя ў дзяцінстве адносіны. Так, дзяўчынка, якая вырасла ў сям'і алкаголіка, часта выбірае ў дарослым жыцці партнёраў-алкаголікаў. Непітушчыя мужчыны падаюцца ёй нецікавымі. Жанчын, якія атрымалі першы сэксуальны вопыт у сітуацыі згвалтавання, выраслі ў сем'ях, дзе яны былі непатрэбнымі, нежаданымі дзецьмі, аказваліся ахвярамі бацькоўскай агрэсіі. Жанчыны, якім могуць навязваць сэксуальныя адносіны нежаданыя партнёры, часта вырастаюць у сем'ях аўтарытарных бацькоў, якія ўсё вырашаюць за дзіця, не лічацца з яго меркаваннем. Чалавек з заніжанай, няўстойлівай, канфліктнай самаацэнкай часта з дапамогай сэксу спрабуе рашаць праблемы, якія не маюць да яго адносінаў. Для чалавека з высокай адэкватнай самаацэнкай і добра развітай сэксуальнасцю сэкс валодае самастойнай каштоўнасцю, яго мэта ў сэксуальным жыцці — дарыць і атрымліваць задавальненне. Калі гэта ваш выпадак, застаецца толькі падзякаваць бацькам за правільнае выхаванне і самім расціць свабодных дзяцей. У здаровай сям'і бацькі папярэджваюць дзяўчынку-падлетка аб наступствах непажаданай цяжарнасці і захворванняў, а таксама аб кантрацэптыўных сродках. Яны не пакутуюць ад пытання: а раптам маю дзяўчынку выкарыстаюць і кінуць? Калі дзяўчынка вырасла ў сям'і любячых бацькоў, у якіх у сваю чаргу з сэксуальным жыццём усё ў парадку, ніякіх цяжкіх псіхатраўмаў у яе ўзнікнуць не павінна. Яна не аддасць перавагу нелюбімаму партнёру або таму, хто яе зневажае, адмову партнёра або спыненне адносінаў не ўспрыме як трагедыю.

## ЗРАБІ ПАЎЗУ — ПАГЛЯДЗІ СЕРЫЯЛ

**За што мы так любім серыялы? Для псіхолагаў гэта не загадка.**

Серыялы дораць нам пачуццё занятасці: на прагляд патрабуецца шмат часу, і гэта падстава для таго, каб не рабіць у гэты момант штосьці іншае. Серыялы служаць нам тэмай для размоў, і для тых, каму не стае стасункаў у рэальным жыцці, тэлегероі становяцца амаль членамі сям'і: за іх перажываюць, ім спачуваюць. Пры гэтым глядач не можа браць удзел у падзеях, а значыць, і несці за іх адказнасць. Гэта дае ўнікальнае спалучэнне адчування судачынення да таго, што адбываецца, і ўласнай бяспекі.

На думку спецыялістаў, ёсць і яшчэ адзін аспект. Дзеянне любога серыяла расцягнута ў часе. Падзеі, словы шматразова паўтараюцца. Ад такога часу немагчыма адстаць, бо прапушчанае лёгка наганяецца. І такая эстэтыка бясконцай адтэрміноўкі заспакойвае, дае перадышку. Мы занадта стамляемся ад сучаснага аб'ёму інфармацыі і маем патрэбу ў тым, каб зрабіць паўзу, запаволіць тэмп жыцця. Музычны ці рэкламны тэлекліп выклікае шок, а серыял — звычку і пачуццё размеранасці існавання. Паміж двума гэтымі рэжымамі мы сёння і існуем.

**Вядучая рубрыкі**
**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# КАРАНІ, ПУШЧАНЫЯ Ў СТАГОДДЗІ



Ткацкі станок для гарадскіх дзяцей — дзіва дзіўнае!

Хто часта бываў на вёсцы, думаю, неаднаразова трапляў у такую сітуацыю, калі замест імя і прозвішча ў цябе пытаюцца: «А чый ты, сынок, будзеш? Чыёга роду?». У якасці адказу даводзілася перабіраць усіх родных, як па матчынай, так і па бацькавай лініях, пакуль суразмоўца задаволена не ўскрыкваў: «А! Ведаю, ведаю. Я ж са стрыечным пляменнікам твайго дзеда калісь разам кароў пасвіў». Ведаць свае карані для вяскоўца — не абавязак. Гэта як пачуццё неабходнасці штораніцы мыцца: і першае і другое цвёрда закладзена з дзяцінства.

У старажытнасці ведаць продкаў лічылася ледзьве не свяшчэнным абавязкам кожнага чалавека. Крыху пазней наяўнасць радаводу стала важным атрыбутам эліты грамадства. Сёння ж, у лепшым выпадку, наша веданне гісторыі сям'і абрываецца на прабабулях і прадзядулях.

У 2006 годзе ў «Брэсцкай друкарні» абмежаваным тыражом (200 экзэмпляраў) выйшла кніга «Памяць». Яна прыцягвае ўвагу чытача, хутчэй, не напаўненнем, а самой задумкай: старонкі «Памяці» расказваюць пра чатыры няпоўныя стагоддзі жыцця рода Манцаў. Аўтар — Аляксей Фёдаравіч Манец — з дапамогай архіваў, царкоўных кніг і аповедаў старажылаў здолеў даследаваць свой радавод аж да 11-га калена. Практычна з моманту яго з'яўлення на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

— Звычайна пра гісторыю сваёй сям'і мы даведваемся з вуснаў бацькоў, бабуль ці дзядуляў. Я такой магчымасці быў пазбаўлены. З чацвёртага класа мяне (бацькам складана было выхоўваць 4 дзяцей) аддалі ў школу-інтэрнат. Пасля яе заканчэння адразу паступіў у Брэсцкі будаўнічы тэхнікум. Размеркаванне ў Гродзенскую вобласць, служба ў арміі. Пасля службы нарэшце атрымалася пабыць дома, праўда, толькі адзін дзень: абкам камсамола накіраваў на моладзевае будаўніцтва ў горад Сургут. Тады мне сказалі: «Ну, адпрацуеш год і можаш вяртацца. Нам галоўнае «птушачку» паставіць, што накіравалі». У Сібіры ж я адпрацаваў 28 гадоў. Жывымі я ўжо не застаў ні бабуль, ні бацькоў. А душэўная патрэба спазнаць і не страціць ад гэтага не толькі не згасла: хутчэй, наадварот — узрасла, — растлумачыў інтарэс да гісторыі сям'і аўтар.

Вывучаючы расліну, біёлаг абавязкова звяртае ўвагу на глебу, у якую яна пускае карані. Даследуючы свой радавод, Аляксей Фёдаравіч не змог адкінуць у бок гісторыю, часткай якой стаў род Манцаў. Адразу пасля вяртання на радзіму ён разам з жонкай заснаваў Брэсцкае гарадское грамадскае аб'яднанне «Славянскае таварыства «Адзінства»». Асноўная задача — збор фальклору, гісторыка-этнаграфічных матэрыялаў, прадметаў вясковай культуры і побыту. Вынік апошняй экспедыцыі «Апрацоўка лёну, ткацтва» — стварэнне музея, які сёння размяшчаецца ў асобным пакоі ў доме Аляксея Фёдаравіча. Заходзіш у міні-музей і складваецца ўражанне, быццам трапіў у старую вясковую хату. Вось толькі што тут сядзелі жанчыны і за размовай ці за песняй займаліся ткацтвам і выцінанкай. У цэнтры стаіць самы галоўны і самы старажытны экспанат — ткацкі станок. Ён выраблены за некалькі гадоў да Першай сусветнай вайны майстрам Іванам Кузьміцкім. Побач са станком хістаецца падвешаная да столі люлька. Стаяць адпаліраваныя часам і рукамі прасніцы. Ляжаць саматканыя ручнікі.

— Чаму менавіта лён? Бо ён — неад'емная частка гісторыі і культуры беларускага народа. А з дапамогай прадстаўленых у музеі экспанатаў можна прасачыць увесь працэс апрацоўкі лёну, пачынаючы ад абмалочвання і да складвання гатовай тканіны ў куфар. Працэс вельмі працаёмкі. Спачатку лён садзілі, потым палолі, рвалі, вязалі ў снапы, абмалочвалі. Абмалочаны лён вылежвалі, каб падчас трэпкі кастрыца лепш аддзялялася ад валакна. Для жанчыны таго часу «трэпала» — нешта кшталту сякеры для мужчыны: авалодваць тонкасцямі работы пачыналі з дзяцінства. Пасля трэпкі лён часалі, церабілі, распушвалі і толькі потым пралі. Мы нават аматарскі фільм на тэму ручной апрацоўкі лёну знялі, — дзеліцца дасягненнямі старшыня таварыства.

Музей узорнага ткацтва адкрыты для ўсіх ахвотных. Напрыклад, нядаўна яго наведала больш за 30 брэсцкіх пяцікласнікаў. Для гарадскіх дзяцей ткацкі станок — дзіва дзіўнае. Ім складана ўявіць час, калі ўсё трэба было рабіць сваімі рукамі, а не набываць у краме. Экскурсавод — вучаніца чацвёртага класа Маша (малодшая дачка Аляксея Фёдаравіча) адчувае сябе ў музеі як рыба ў вадзе: яна не проста вывучыла працэс апрацоўкі лёну, але і сама ў вольны час з задавальненнем асвойвае ручное ткацтва. На сапраўдным ткацкім станку!

Была ў Аляксея Фёдаравіча мара пабудаваць у Брэсце «Славянскі дом», па планіроўцы падобны да звычайнай сялянскай хаты. Дом, куды б змаглі пераехаць усе экспанаты, у сценах якога ажылі б сабраныя падчас экспедыцый старажытнаславянскія абрады. З-за адсутнасці грошай мара пакуль застаецца марай.

І яшчэ цікавая дэталь. Летась з дапамогай старажылаў за 27 кіламетраў ад Брэста былі знойдзены 3 курганы. Магчыма, гэта захаванні часоў Паўночнай вайны 1700 года?.. Мясцовыя жыхары пацвердзілі, што да 1914 года іх дзядулі напярэдадні Вялікадня па загаду вясковага старасты падвозілі жоўты пясок і пасыпалі ім курганы. Паводле іх слоў, у двух курганах пахаваныя рускія салдаты, а ў трэцім — шведскія. Старшыня Брэсцкага гарадскога грамадскага аб'яднання «Славянскае таварыства «Адзінства» знайшоў людзей, здольных матэрыяльна падтрымаць добраўпарадкаванне і ўвекавечванне пахаванняў. (Сярод іх мэр Хабараўска Аляксандр Сакалоў і прадстаўнікі будаўнічых арганізацый Сургута.) Але ідэю Аляксея Фёдаравіча пакуль не падтрымалі, паколькі адсутнічаюць дакладныя звесткі, якія пацвердзілі б словы старажылаў.

...Аляксей Манец цвёрда перакананы: «Жудасна быць жывым і не асэнсоўваць, хто ты. Памяць дапамагае аб'яднаць падзеі, гэта наш розум, нашы ўчынкі, нашы пачуцці. Без яе мы нішто...».

**Аляксандр АЛЕСІК.**
**Фота аўтара.**



Бабулі паказваюць працэс апрацоўкі лёну.

# АМБІЦЫІ, АМБІЦЫІ...

Дзённік бландзінкі



**Чытаю ў Інтэрнэт-дзённіках маладых літаратараў.**

**«Я, напэўна, магла б стаць заслужаным майстрам спорту па акрабатыцы... ці народнай пісьменніцай Беларусі».**

**«Калісьці я мог стаць вялікім беларускім пісьменнікам...»**

**Так выглядае, што яны, сапраўды, упэўненыя, што ўяўляюць цікавасць для цэлага народа, і ўсё залежыць толькі ад іх жадання. Столькі юнацкай шчырасці ў гэтых прызнаннях, што нават не хочацца іранізаваць...**

## Нашы

Неяк мая сяброўка сказала:

— Да таго, як я пераехала ў Ізраіль, мне здавалася, што ўсе яўрэі — альбо музыкі, альбо мастакі, альбо матэматыкі. А, аказваецца, большасць з іх шафёры, сантэхнікі, будаўнікі...

Мне ж да нядаўняга часу здавалася, што ўсе беларускамоўныя ў гэтым горадзе — прыстойныя людзі. А сярод іх ёсць і зайздроснікі, і кар'ерысты, і проста нявыхаваныя...

## Асацыяцыі

Слова «кулуары» заўсёды асацыюецца ў мяне са словам «курылка» (месца для палення).

Так і хочацца сказаць — «куруары».

## Ці варта мацюкацца ў паэзіі?

Днямі гаварыла ў Інтэрнэце з маладым паэтам — ці варта мацюкацца ў паэзіі.

Пазіцыю сваю выклала досыць катэгарычна: «...паважайце чужую чысціню, паважайце права прыходзіць на паэтычныя чытанні па гармонію».

Але ж для мяне самой — і як крытыка, і як чытача — застаецца ў гэтым пытанні шмат нюансаў. Бо, па-першае, сама я не з'яўляюся пурысткай, па-другое, ведаю дастаткова выпадкаў, калі мат быў абсалютна дарэчным, і не баюся гэта сказаць — адзіна правільным стылістычным рашэннем...

*Калі у вачох цямнее,*
*мне хочацца проста ўкленчыць:*
*«О Божа, хачу да мамы!*
*да таты хачу на плечы...»*
*Каб апынуцца ў дзяцінстве,*
*як калісь — хавацца ў шафе*
*сярод кажухоў і шапак,*
*цукеркі цягаць з буфета*
*ды красьці ў суседа сьлівы...*
*І быць маленькім і лёгкім,*
*і, ...шчаслівым.*

Калі ў беларускай літаратуры і ёсць верш, аўтарства якога мне хацелася б прыпісаць сабе, то гэта прыгаданы верш Насты Манцэвіч. Па-першае, ён цалкам адлюстроўвае м а ё адчуванне свету — немагчымасць, нежаданне і непадрыхтаванасць вырашаць праблемы, ланцуг якіх быў звязаны не мной, і не на мне скончыцца... Ён адлюстроўвае маю прагу цяпла і ўтульнасці, м а ё незрэалізаванае права быць абароненай. Ён увасабляе маё ўяўленне пра правіны і магчымую ступень іх цяжкасці...

Але, трэба прызнаць, абсалютна н е м а і м «вашу маць» Наста змагла стварыць сапраўдны контрапункт верша і актуалізаваць зацяганае слова «шчаслівы».

Рэдкі выпадак, калі слова са спеву не выкінеш.

## Селяшчук і натуршчыцы

Схадзіла на выставу М. Селешчука ў Мастацкім музеі. Некалі я была вялікай аматаркай гэтага Вялікага Казачніка. З першай, пабачанай у часопісе «Маладосць», рэпрадукцыі. Я плакала перад яго карцінамі на сумеснай выставе ў 1986-м... Падумвала, а ці не набыць мне яго ілюстрацыі — неяк прадаваліся на выставе-продажы ў Палацы мастацтва.

А цяпер... Складаныя ўражанні. Напрыклад, толькі зараз заўважыла, што ўсе яго натуршчыцы выглядаюць як нябожчыцы — з сіне-зялёнымі тварамі. «Карціны памерлі разам з мастаком», — сказаў адзін беларускі пісьменнік. Містыка... Затое згадалася показка.

Прыходзіць мастак у любімы бар і раптам бачыць там новую дзяўчыну.

— О-о-о! — кажа ён. — Як гэта міла! Такая новая дзеўчына ў такім старым мейсцы!

Ён падсаджваецца да дзяўчыны і кладзе ёй руку на каленку.

— Я — натуршчыца Пікаса, — заўважае дзяўчына.

— Цудоўна! Сустрэць тут натуршчыцу, так бы мовіць, калегі... — кажа мастак і падсоўвае руку далей.

— Я — натуршчыца Пікаса! — з націскам кажа дзяўчына.

— О, я зразумеў, зразумеў... Але да чаго гэта?

— А да таго, што тое, што вы там шукаеце, знаходзіцца ў мяне за левым вухам!

Натуршчыцы — натхняльніцы... Хто і калі праліччыць іх унёсак у сусветную культуру?

## Плеяда беларускіх зорак

Некалі мне стала цікава — чаму і як мяняюцца культурныя парадыгмы, ці ёсць у гэтым заканамернасць?

Больш-менш спатоліў маю цікаўнасць знакаміты рускі даследчык Ю. Лотман, які ў кнізе «Семіасфера» сцвярджаў, што рэвалюцыя ў культуры можа адбыцца толькі тады, калі адбудзецца рэвалюцыя ў камунікатыўных сродках перадачы інфармацыі... Аднак яшчэ больш цікавілі мяне зрухі ў нацыянальных літаратурах, чым выкліканы яны — развіццём эканомікі, уздымам нацыянальнай свядомасці, прарывам у адукацыі, дэмаграфічным зрухам, у выніку якога з'яўляюцца плеяды — суквецце талентаў? Цікавым мне падаўся момант у гісторыі ангельскай літаратуры, калі пасля разгрому Непераможнай Армады з'явілася Елізавецінская Плеяда. Яе ўзнікненню, як лічыць Ул. Арол, спрыяла тое, што Англія стала марской супердзяржавай, у выніку чаго «межы айкумены неверагодна пашырыліся на памяці аднаго пакалення». Менавіта паэтам-мараходам мы абавязаны сур'ёзнасцю санэта, прынамсі, той сур'ёзнасцю, якую мы ўкладаем у яго сёння. Аднак адначасовае з'яўленне вялікай колькасці зорак на літаратурным небасхіле можа адбывацца і ў суседніх краінах. У выпадку з Англіяй — у Францыі.

І вось, гаворачы з літаратуразнаўцам Ул. Мархелем пра Пушкінскую Плеяду, я даведалася, што ёсць і ў беларусаў свая Плеяда. Мархель, адзін з лепшых спецыялістаў па літаратуры XIX ст., адаслаў мяне да верша Адама Плуга «Да Ігната Дамейкі», дзе ёсць словы:

*За тваю Тамаша, друг адданы і Яна,*
*Эдуарда, Адама і цэлай Плеяды*
*Прамяністай, што ад Бога прыслана,*
*Каб айчыннаю славай ясніць далягляды,*
*Запаліўшы святы Зніч на родным алтары,*
*Зніч любові й ахвяр, і з яго палымнення*
*Іскры ўжо з пакалення пайшлі ў пакаленне.*

Тамаш Зан, Ян Чачот, Адам Міцкевіч, Ігнат Дамейка, Адам Сузін, Ануфры Петрашкевіч, Антоні Эдвард Адынец, Аляксандр Ходзька... Іх імёны сапраўды складаюцца ў плеяду — Прамяністую Плеяду беларускай культуры. Аднак жа, калі пра паплечнікаў Пушкіна мы чуем са школьнай парты, імёны айчынных зорак застаюцца часцяком невядомымі нават настаўнікам.

## У што я веру

Веру, што чалавечае жыццё ў большай ступені абумоўлена гармонамі, чым IQ. А хацелася б — наадварот...

**Ганна КІСЛІЦЫНА.**

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

**«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-4**

Аб'яўляем чацвёрты класіфікацыйны конкурс на прызы калектыву Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (кіраўнік Канстанцін Міхайлавіч БАРЭЛЬ) — з нормай першага спартыўнага разраду па шашках.

Будуць адзначаны пераможцы конкурсу, суддзя конкурсу і каардынатар, а таксама лепшая рашальніца. А каб стаць першакласным рашальнікам, трэба быць вельмі пільным і не прапусціць выпадкі, калі будуць у пазіцыях пабочныя развязкі альбо задумкі аўтара, якія пры моцнай гульні чорных не развязваюцца. Таму за ўказанне такіх істотных недахопаў налічваюцца прэміяльныя балы. Некампазіцыйныя варыянты ў аўтарскім рашэнні і [illegible] не прыводзяцца. Норма ж другога разраду — рашыць усе 12 заданняў, кожнае з якіх ацэньваецца ў адно ачко.

А цяпер падаем першае заданне:



БЕЛЫЯ: е1, дамка d4 (2). ЧОРНЫЯ: g5, дамка h4 (2). Выйгрыш.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а. Рубрыка «Шашкі».

**СКЛАДАЮЦЬ ЗВЯЗДОЎЦЫ**

Пазнаёмцеся з новымі кампазіцыямі, якія даслалі ў рэдакцыю нашы чытачы:

№ 1 (Віталь ВАРУШЫЛА, Мінск). БЕЛЫЯ: d2, d4, e1, h4, h6 (5). ЧОРНЫЯ: b4, b6, b8, c5, e7, f4 (6).

1. de3 2. e:c7 c:e3 3. hg5 4. gf6 5. h:d2x.

№ 2 (Аляксандр ПЕРАВОЗНІКАЎ, Рагачоў). БЕЛЫЯ: c1, c5, c7, d6, g1, g7, h2 (7). ЧОРНЫЯ: d8, e3, e5, f2, f4, g3, h4 (7).

1. gf8 2. fh6 3. cd2 4. g:g5! 5. h:f4 6. h:d8x.

№ 3 (Міхаіл СТЭФАНОВІЧ, Гродна). БЕЛЫЯ: a1, a3, c1, c5, e5, f4, g1, g3, h6 (9). ЧОРНЫЯ: a5, c3, d2, d8, e3, f8, g5, g7, h2, h8 (10).

1. ab2 2. cd6 3. ab4 4. de7 5. h:f2 6. f:a1! 7. c:e7 8. a:g7 9. gf2x.

№ 4 (Іван НАЎРОЦКІ, Мінск). БЕЛЫЯ: a3, b2, c1, e5, e7, f6, h4 (7). ЧОРНЫЯ: a5, b4, b6, c3, c5, d4, e3, h8 (8).

1. ed6 2. cd2 3. ef8 4. a:e3! 5. h:f6 6. f:a7x.



№ 5 (Леанід ВІТОШКІН, Гомель). БЕЛЫЯ: e3, e7, f2, h2, дамкі g3, h8 (6). ЧОРНЫЯ: c5, d4, d6, e5, g5, дамкі f8, g1 (7).

Перамога белых з прыгожым запіраннем дамкі і простай чорных. Знайдзіце перамогу самастойна. Дакладнае рашэнне будзе ўлічана пры падвядзенні вынікаў конкурсу «Пагода ў доме»-4, калі пераможцы набяруць у ім аднолькавую колькасць ачкоў.

Па-за гульнёй

Алег КУБАРАЎ:

# «ЗА НАС «ХВАРЭЭ» СЯРГЕЙ МІНСКІ»

**Самую крыўдную, чацвёртую пазіцыю, у вышэйшай лізе заняла каманда, якую ніхто перад стартам 17-га чэмпіянату Беларусі нават не разглядаў як прэтэндэнта на медалі, акрамя хіба што самых адданых уласных балельшчыкаў. Нехта нават адпраўляў яе адразу ў першую лігу. Памыліліся! Футбалістам жодзінскага «Тарпеда» не хапіла аднаго ачка, каб заняць месца ў прызавой тройцы. Свайм дасягненнем жодзінцы могуць назваць і самую невялікую колькасць паражэнняў, бо ўступілі толькі пяць разоў (двойчы БАТЭ, брэсцкаму «Дынама», «Нафтану», МТЗ-РІПА). Ці гатова «Тарпеда» пайсці па шляху БАТЭ з суседняга горада (Жодзіна і Барысаў знаходзяцца на адлегласці 15 км адзін ад другога) і прабіцца на п'едэстал, за якую каманду выступае сын галоўнага трэнера жодзінцаў, а таксама на іншыя пытанні карэспандэнта «Звязды» адказаў галоўны настаўнік каманды Алег КУБАРАЎ.**



Фота Вольгі ЛАСКІ.

**— Алег Міхайлавіч, вашу каманду называюць адкрыццём чэмпіянату. Вы самі чакалі, што зоймеце настолькі высокае месца?**

— Само чацвёртае месца для мяне сапраўды было нечаканасцю. А вось той гульнёй, якую дэманстравалі нашы ігракі, я не быў здзіўлены. Яна з'явілася не адразу. Такая добрая гульня — вынік доўгай працы.

**— Віншаванне каго з калег было для вас прыемным сюрпрызам?**

— Юрыя Вяргейчыка (галоўны трэнер «Шахцёра». — **Аўт.**).

**— На вашу думку, чаго не хапіла вашай камандзе, каб трапіць у тройку, акрамя аднаго ачка, якое аддзяліла «Тарпеда» ад трэцяга месца?**

— І ад другога таксама. Нам не хапіла мэтанакіраванасці, бо з пачатку чэмпіянату ні мы, ні кіраўніцтва клуба не ўзнялі перад нашымі ігракамі высокую планку. У іх проста не было матывацыі, каб заняць высокае месца. У некаторых іншых камандах, ведаю, прадугледжана ўзнагароджанне нават за 6-е, 8-е месцы. Перад намі ж паставілі задачу — выступіць лепей, чым у мінулым сезоне (тады каманда заняла 11-е месца), стварыць сапраўдную каманду, якая не гублялася б унізе табліцы, а гуляла ўпэўнена.

**— Вам гэта ўдалося. Магчыма, кіраўніцтва клуба пасля такога поспеху паставіць перад камандай больш высокую задачу ў наступным чэмпіянаце і зацікавіць ігракоў нейкім заахвочваннем?**

— Я не хацеў бы бегчы наперадзе цягніка. Аб будучым казаць рана. Каб змагацца за больш высокае месца, патрэбна рыхтаваць добрую матэрыяльную базу.

**— Гульня якой з камандаў-сапернiц стала для вас прыемным сюрпрызам?**

— Я магу адзначыць БАТЭ, бо барысаўчане змагаліся на трох франтах, не зніжаючы абаротаў, і ўдала прайшлі ўвесь сезон, перамаглі ў чэмпіянаце датэрмінова. У ходзе першынства я думаў, што і МТЗ-РІПА датэрмінова зойме прызавое месца. У клуб вярнуўся тытулаваны трэнер, здавалася, што камандзе стане лягчэй, але нешта перашкодзіла мінчанам быць у тройцы. Ім трэба прааналізаваць, у чым прычына гэтага. Для кагосьці цудам стаў поспех «Гомеля». Юрэвіч (галоўны трэнер «Гомеля») любіць казаць, што цуды адбываюцца толькі ў казках. Сапраўды для спецыялістаў дасягненне гамяльчан было відавочным.

**— Жодзіна знаходзіцца непадалёк ад Барысава, каманда якога ўжо другі сезон запар становіцца наймацнейшай. Збіраецеся браць прыклад з суседзяў?**

— Да чэмпіёнства БАТЭ прыйшоў не адразу. У Барысаве пачалі працаваць над стварэннем каманды даўно. Работа была праведзена сур'ёзная. У Жодзіне ж яна толькі пачынаецца.

**— Вы самі родам з Жодзіна. Гэта дапамагае ў працы ў «Тарпеда»?**

— У прафесійным футболе гэтыя абставіны не павінны паўплываць на працу, там галоўнае — веды, а ў нас сапраўды гэта — станоўчы момант.

**— Ці значыць гэта, што вы не разглядаеце наш чэмпіянат і футбол у цэлым як прафесійны?**

— Не. Федэрацыя робіць дастаткова для развіцця футбола ў Беларусі, але патрэбна развіваць футбол яшчэ больш ва ўсіх накірунках. У нас жа свае футбольныя школы маюць толькі клубы-адзінкі. Патрэбна больш уздымаць прэстыж футбола. Наш чэмпіянат не надта рэйтынгавы. Магу параўнаць яго з першынствамі Літвы і Латвіі.

**— За гульнёй якіх замежных камандаў вам цікава назіраць?**

— Гэта «Барселона», «Мілан», «Рэал». Аднак адна справа сачыць за падзеямі на полі з трыбуны і зусім іншая — па тэлевізары. Калі да нас прыехаў «Вільярэал», я нарэшце пабачыў грандаў на свае вочы, і мне стала цікава назіраць і за гэтай камандай. Ну а я мог многаму павучыцца. Гляджу на поле і адразу бачу, у чым адстае мая каманда.

**— Чаму самі маглі б навучыць іншыя беларускія каманды? Магчыма, расказаць, у чым сіла «Тарпеда»?**

— Пакуль мне рана кагосьці вучыць. Я сам зараз вучуся на трэнерскіх курсах. У нас няма яркіх «зорак», мы не можам сабе дазволіць гучныя трансферы, таму мы проста спрабавалі стварыць каманду, якая сама магла б быць «зоркай» на полі. Наш поспех — у калектыўным духу.

**— Як вы асабіста адпачываеце ад працы? Ці хапае вольнага часу на сям'ю?**

— Я па натуры жаваранак. Спрабую так размяркоўваць час, каб яго хапіла і на футбол, і на сям'ю. Наконт адпачынку... Я люблю быць на прыродзе, езджу на дачу. А наогул мне не падабаецца сядзець без справы.

**— У вашай сям'і яшчэ хтосьці звязаны з футболам?**

— Старэйшы сын, яму 15 гадоў, трэніруецца ў МТЗ-РІПА. Ён паўабаронца. Аднак для мяне, як для бацькі, галоўнае, каб ён быў здаровым і добра вучыўся.

**— Хто з беларускіх знакамітасцяў «хварэе» за «Тарпеда»?**

— Дакладна ведаю, што спявак Сяргей Мінскі. Ён сам гуляе ў футбол за каманду «Арт Старз». Мы пазнаёміліся, калі я таксама выступаў за яе.

**Ірына ПРЫМАК.**



Свята для меламанаў

# «Мінск Блюз 2007»

**18 лістапада ў малой зале Палаца Рэспублікі пройдзе фестываль «Мінск Блюз 2007».**

Асноўная ідэя фестывалю заключаецца ў папулярызацыі жывой блюзавай музыкі ў Беларусі, а таксама адкрыццё маладых таленавітых музыкантаў. Менавіта таму арганізатары форуму плануюць сабраць на адной сцэне грандаў айчыннага блюза і прадстаўнікоў маладога пакалення блюзмэнаў.

Чакаецца выступленне такіх маладых перспектыўных камандаў, як «Cross B Band», «Danny & Willie Blues Mob», Сяргей Курык і «3D Blues» (Гомель). Несумненна, на сцэну малой залы Палаца Рэспублікі ўзойдуць і мэтры «Flat», «Al Narrator Orchestra» (Гомель), «Madera Hard Blues», і, безумоўна, «Svet Boogie Band» — лепшы блюзавы гурт краіны, каманда-пераможца вялікай колькасці конкурсаў, якая і стане хэдлайнерам фестывалю. Выбар гэтых камандаў не выпадковы: усе разам яны адлюстроўваюць асобныя перыяды ў гісторыі станаўлення і развіцця гэтага цудоўнага музычнага жанру з моманту яго з'яўлення да нашых дзён — гэта архаічны акустычны блюз з берагоў Місісіпі («Danny & Willie Blues Mob»), і «маланкавы» блюз-рок а ля Jimmy Hendrix (Сяргей Курык і «3D Blues», «Madera Hard Blues», «Flat»), і вытанчаны спакой клубнай атмасферы («Svet Boogie Band»).

Падобнае мерапрыемства праводзіцца ў другі раз і служыць працягам фестывалю «Мінск Блюз-2006», які адбыўся летась у адным са сталічных клубаў пры поўным аншлагу.

**Марына ПЫРКОВА.**

## Спорт-тайм

### Рэкорд «Арсенала»

Лонданскі «Арсенал», за які выступае Аляксандр Глеб, вярнуў сабе лідарства ў англійскай прэм'ер-лізе. Пасля перамогі ў матчы 13-га тура ў гасцях у «Рэдынга» (3:1) «кананіры» набралі 30 ачкоў («Арсенал» апярэджвае «Манчэстар Юнайтэд» па дадатковых паказчыках). Беларускі паўабаронца вызначыўся ў гульні голам і выніковай перадачай і быў заменены на 79-й хвіліне. Лонданцы ўжо не прайграюць на працягу 27 матчаў запар, што з'яўляецца рэкордам клуба.

### Уладзімір Валчкоў нагадаў пра сябе

На турніры серыі «ф'ючэрс» з прызавым фондам 15 тысяч долараў у брытанскім Рэдбрыджы беларускі тэнісіст Уладзімір Валчкоў аказаўся мацнейшым за датчаніна Фрэдэрыка Нільсена ў фінале адзіночнага разраду — 6:1, 4:6, 6:4. У пары мінчанін выступаў з земляком Андрэем Каратчэнем. Наш дуэт дайшоў да паўфіналу.

### Футбол і смерць

Некалькі матчаў 12-га тура італьянскага чэмпіянату па футболе перанесены на невядомы тэрмін з-за сутыкнення фанатаў з паліцыяй. Гульня паміж «Лацыо» і «Інтэрам» адкладзена з-за смерці балельшчыка рымскага клуба: адзін з супрацоўнікаў праваахопаду застрэліў фаната.

## Пекінская «капуста»

### АДЛІК АЛІМПІЙСКАГА ЧАСУ

За 230 дзён да старту пекінскай Алімпіяды па праспекце Пераможцаў ля сталічнага Палаца спорта адбудзецца адкрыццё стэлы «Алімпійскі час». Яе вышыня — больш як 4 метры. На трохбаковым табло можна будзе пабачыць адлік часу да пачатку летняй Алімпіяды-2008. У той жа дзень у гарадской ратушы будуць падведзены спартыўныя вынікі года, у тым ліку — конкурсу малюнкаў «Спорт і мастацтва» (работы-пераможцы будуць выстаўлены ў Пекіне, галоўны прыз — 30 тысяч долараў), і аб'яўлена дзесятка лепшых атлетаў-2007.

**Ірына АНАТАВА.**

# Беларусы рыхтуюцца да «матча-прывіда»

**Дваццаць адзін футбаліст нацыянальнай зборнай Беларусі рыхтуецца да адборачнага матча ЧЕ-2008 супраць Албаніі на радзіме галоўнага трэнера — у нямецкім Руйце. Гэтае месца Бернд Штанге назваў «ідэальным варыянтам для трэніровак, бо там зараз добрае надвор'е — каля 10 градусаў цяпла».**

Суботні паядынак з албанцамі ў Цiране настаўнік беларусаў ахарактарызаваў як «матч-прывід», таму што гульня ў гасцях адбудзецца пры пустых трыбунах (УЕФА дыскваліфікаваў стадыён з-за неэтычных паводзінаў балельшчыкаў 12 верасня ў гульні з галандцамі, калі адна з кінутых з трыбун петард трапіла ў галаву іграку гасцей). Дарэчы, гэта — першы такі выпадак за 35-гадовую кар'еру нямецкага спецыяліста. «Такія сустрэчы перашкаджаюць футболу, які створаны для гледачоў, — заявіў паўабаронца расійскага «Тарпеда» Максім Рамашчанка. — Матывацыя выйграць у нас вялікая, бо ўсе жадаюць добра завяршыць сезон». Сапернікі нашай зборнай часова засталіся без свайго галоўнага трэнера Ота Барыча, які быў дыскваліфікаваны на тры матчы за абразу арбітраў у час паядынку 17 кастрычніка.

Напярэдадні матча ў Албаніі Бернд Штанге паведаміў, што эксперыменты ў зборнай завяршыліся, а за чатыры месяцы яго працы ў Беларусі ў камандзе сабраны ўсе лепшыя футбалісты. «У нашай зборнай няма ніякіх канфліктаў паміж ігракамі і трэнерам, — кажа Штанге. — Зараз у калектыве баланс вопыту і маладосці, таму я чакаю паляпшэння нашай гульні. Мы прымаем крытыку ў наш адрас за паражэнне ў Гомелі. У мяне ёсць адчуванне, што каманда створана. У гэтым аптымальным складзе мы правядзём некалькі таварыскіх сустрэч у наступным годзе». Паводле правілаў Штанге, нацыянальная каманда павінна быць для іграка на першым месцы, а клуб — на другім. Маладыя футбалісты, на думку трэнера, могуць браць прыклад з Аляксандра Глеба, Максіма Рамашчанкі, Васіля Хамутоўскага. Штанге разлічвае і на дапамогу вопытных ігракоў — Віталя Кутузава, Аляксандра Кульчыя і Віталя Булыгі.

**Ірына ПРЫМАК.**

# ПЛУГ І МАЛАКО,

## або Разважанні дылетанта

**Вялікая група (28 чалавек) кіраўнікоў сельгаскааператываў Брэстчыны выехала за мяжу, каб у чарговы раз пазнаёміцца з работай калег, якія займаюцца вытворчасцю сельгаспрадукцыі, і наведаць прадпрыемствы, дзе выпускаецца тэхніка для сельскай гаспадаркі. Яны пабывалі ў Бельгіі, Германіі і Францыі і на свае вочы ўбачылі многае з таго, што можна было б пераняць і выкарыстаць на радзіме. Пра дасягненні аграпрамысловага комплексу ў заходніх краінах даводзілася чуць на працягу многіх гадоў. І тут нічога новага няма. А нам, найперш, хацелася б ведаць, калі наша прадукцыя стане канкурэнтаздольнай?**

Дэлегацыя з Брэстчыны пабывала на фірме «Gregoire Besson», што ў Францыі. Тут на невялікім заводзе вырабляюць плугі, якія пастаўляюцца і ў Беларусь. Здавалася б, з сельскагаспадарчай тэхнікі плуг не такі ўжо і складаны агрэгат, каб мы не маглі выпускаць гэтую прадукцыю на сусветным узроўні. А высветлілася, што і тут вядзецца жорсткая канкурэнтная барацьба. І, на жаль, нашы плугі па ўсіх параметрах прайграюць французскім.

А ў чым тут справа, я спытаў у старшыні СВК «Асавецкі» Драгічынскага раёна Станіслава Цынкуса, які разам з дэлегацыяй пабываў на французскім заводзе.

— У нас два плугі фірмы «Gregoire Besson» і яны ні ў якое параўнанне не ідуць з нашымі. Мы ўжо аром імі пяты сезон і не можам нарадавацца. Гэты плуг вельмі просты, надзвычай эфектыўны і надзейны. Адзін французскі плуг замяніць тры айчыннай вытворчасці.

— Дык у чым сакрэт тых плугоў? Няўжо ў нас нельга наладзіць выпуск калі не лепшых, то хоць бы такіх жа?

— Пры распрацоўцы сваёй прадукцыі французы ўлічылі ўсе нюансы работы плуга. Вось скажам, калі гной саломісты, то нашым плугам поўнасцю заваліць яго не ўдаецца, а французскім — без праблем. На Драгічынскім рамонтна-трактарным заводзе выпускаюць плугі коштам 32 млн рублёў, а плуг фірмы «Gregoire Besson» абыходзіцца на дзесяць мільёнаў даражэй, але ж з апошнім працаваць адно задавальненне, і тыя мільёны акупяцца. І гэта датычыцца не толькі плугоў, але і другой сельгастэхнікі, напрыклад, раскідвальнікаў мінеральных угнаенняў фірмы «Sulky». Скажу, што заходнюю тэхніку вытворцы імкнуцца давесці да дасканаласці ды і метал выкарыстоўваецца адпаведнай якасці.

І тут я хачу прывесці адзін вядомы факт. Нямецкая фірма ў адным нашым сельгаскамбінаце ўстанаўлівала транспарцёр для выдалення гною з фермы. І падчас мантажу выявілася, што прывезлі металічныя пласціны не таго памеру. Што можа быць прасцей за пласціны, якія выграбаюць гной? А калі пачалі шукаць метал патрэбнай маркі, то аказалася, што яго можна купіць толькі на абаронным прадпрыемстве дзесьці на Урале. Немцы прыкінулі, што больш танна і надзейна будзе прывезці тыя пласціны з Германіі.

Адным словам, жорсткая канкурэнцыя ідзе ў эканоміцы па ўсіх параметрах і каб выжыць, неабходна выпускаць прадукцыю толькі высокай якасці, знаходзіць сваю нішу, інтэгравацца ў сусветную эканоміку.

Відавочна, ніхто сёння не будзе адмаўляць, што Беларусь — эканамічна развітая краіна, але ці здольны мы самастойна выпускаць усю прадукцыю на сусветным узроўні? Грузавікі, трактары, камбайны, тралейбусы, аўтобусы... Толькі гэты пералік уражвае — асартымент вельмі сур'ёзны. Але наколькі нам патрэбны два заводы па выпуску тэлевізараў? Як выстаяць гадзіннікаваму заводу? Што рабіць з Баранавіцкім тэкстыльным камбінатам? Прадпрыемства ўжо «з'ела» дзесяткі мільярдаў дзяржаўных грошай, то мо за лепшае было б перадаць камбінат у прыватныя рукі. Сёння самае важнае — вярнуць прадпрыемствы да поўнакроўнага жыцця.

Некалі на прадпрыемствах было папулярным цячэнне па падрыхтоўцы спецыялістаў-шматстаночнікаў. Рабочы павінен быў умець працаваць на розных станках: такарным, фрэзерным, свідравальным і г. д. А потым ад гэтага адмовіліся, бо аказалася, што рабочы-шматстаночнік ні на адным станку не здольны добра працаваць. Не хацелася б, каб Беларусь аказалася ў ролі краіны-шматстаночніцы.

Тыя ж Нідэрланды аэробусаў не вырабляюць, а ўчапіліся за зямлю і нават на кветках маюць мільярдныя прыбыткі. Але колькі пра гэта гаварыць?!

Відавочна, усё ж давядзецца нам выбраць свае прыярытэтныя напрамкі эканамічнага развіцця і менавіта найперш на іх засяродзіць увагу.

Вось возьмем сітуацыю з малаком. Попыт на яго вырас ва ўсім свеце. Кітайцы, якія спрадвеку пілі чай, раптам рассмакавалі малако, а кітайцаў паўтара мільярда.

Сёння ў Расіі 1л малака каштуе 2500 рублёў, а цвёрды сыр — за 20 тыс. нашых. А ці здольныя беларускія сельгаспрадпрыемствы «заліць» Расію малаком? Не! Хоць, безумоўна, зрухі ў сельскай гаспадарцы Беларусі відавочныя. Узводзяцца ў вёсцы дамы па дзяржаўнай праграме, дзейнічаюць сацыяльныя стандарты, а надоі растуць не такімі тэмпамі, як хацелася б.

А кіраўнікі сельгаскааператываў сёння ўжо на старонках абласной прэсы («Народная трыбуна», «Вечерний Брест») падчас «круглых сталоў» адкрыта гавораць, у чым справа.

Маўляў, у нас сеюць на землях з нізкай бальнасцю і не звяртаюць увагу на затраты, а на Захадзе лічаць кожную капейку і на няўдобіцах пасуць кароў.

На нашы фермы пастаянна прыязджаюць з праверкай (а кантраляваць можа 21 арганізацыя), могуць прыдрацца да любой дробязі ды і накласці штраф, а да замежных вытворцаў прыходзяць двойчы ў месяц праверыць малако — іх цікавіць якасць канчатковай прадукцыі, а не працэс яе вытворчасці.

Зямлі патрэбен гаспадар, але чамусьці ў вёсцы ён і не з'явіўся, як і паўстае кадравае пытанне — не хочуць маладыя спецыялісты затрымлівацца ў сельскай гаспадарцы.

Праблема яшчэ і ў тым, што вярнуць гаспадара на зямлю, нават уласную, адным росчыркам пяра не ўдаецца. Яго ў патрэбнай колькасці няма.

— Працаваць мы ўмеем, — заявіў Станіслаў Цынкус, — і не горш, чым тыя немцы, але жывём у іншай краіне і сістэме, а таму павінны рэальна глядзець на рэчы. Там кожны фермер сам думае, як вытрымаць канкурэнцыю і вольны ў выбары. Мы яшчэ жывём па сістэме плюс-мінус. Які прырост у параўнанні з мінулым месяцам, годам... і за гэта павінны даць справаздачу.

Яно, быццам бы і так, але, здаецца, перадачай зямлі ў прыватныя рукі праблемы не вырашыць. Патрэбны захады, каб перагледзець вытворчыя адносіны ва ўсіх сферах эканомікі, бо надоі залежаць не толькі ад каровы, але і плуга...

Банальная ісціна?

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

